**Дзяржкантроль Мінскай вобласці высветліў, што значная частка стабілізацыйных фондаў расліннай прадукцыі згніла або была дачасна прададзена. Як вынік — цэны на садавіну і гародніну ўзраслі на рынках вобласці ў паўтара — два разы, а запасаў капусты амаль не засталося.**

# МЫ НЕ СТАНЕМ БАГАТЫМІ

## Пакуль не перастанем закопваць грошы ў гразь

«І гэта пры тым, што расліннай прадукцыі на Міншчыне вырабляецца дастаткова, — абураўся на нарадзе, прысвечанай захаванасці і выкарыстанню закладзенай у стабфонды прадукцыі раслінаводства, **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці Уладзіслаў ЦЫДЗІК.** — Восенню мы не ведалі, куды падзець бульбу, буракі і іншыя прадукты».

Штогод урад Беларусі дае распараджэнне стварыць стабілізацыйныя фонды харчовых тавараў (прадуктаў жывёлагадоўлі і прадуктаў раслінаводства: бульбы, агародніны, садавіны) на холадакамбінатах, у арганізацыях малочнай і мясной прамысловасці і ў арганізацыях, якія ажыццяўляюць нарыхтоўку, захоўванне, перапрацоўку і рэалізацыю такіх прадуктаў. Харчовыя стабфонды ствараюцца да сярэдзіны лістапада для таго, каб у міжсезонны перыяд усе гэтыя прадукты былі ў крамах Беларусі ў наяўнасці і па абмежаваных цэнах.

Дзеля гэтага аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам усталёўваюць для вытворцаў закупачныя цэны, для нарыхтоўшчыкаў — гранічныя адпускныя, а для рэалізатараў — гранічныя рознічныя цэны. Фінансаванне такіх закупак у стабфонды ажыццяўляецца за кошт ільготных крэдытаў.

— Такім чынам, калі захаваць прадукцыю і трымацца графікаў рэалізацыі, насельніцтва гарантавана атрымае яе на працягу зімы і вясны, і скачка цаны не павінна адбыцца, — тлумачыць **начальнік упраўлення кантролю спажывецкага рынку і сферы паслуг Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці Максім ШЭКО.** — Летась аб'ёмы стабфондаў расліннай прадукцыі былі павялічаны з улікам таго, што ў суседняй краіне — Расіі — год выдаўся неўраджайны. І тым не менш, на пачатак лютага прадукцыі ў стабфондах засталося на сотні тон менш, чым год таму.

Прычын таму шмат, лічаць кантралёры. Гэта і грубыя парушэнні ў тэхналогіі захоўвання гародніны, і прыпіскі, і незацікаўленасць вытворцаў у пастаўках, а нарыхтоўшчыкаў — у рэалізацыі прадукцыі па абмежаваных цэнах... Але, па вялікім рахунку, за стабфонды павінны адказваць канкрэтныя людзі.

— Мы яшчэ ў жніўні мінулага года абавязалі адпаведныя службы навесці парадак у сістэме закупкі сельгаспрадукцыі і сыравіны, — нагадаў Уладзіслаў Цыдзік. — Гэта былі папераджальныя меры. Потым двойчы пісалі лісты, бо выкарыстанне стабілізацыйных фондаў выклікала нараканні. Але, нягледзячы на ўсё гэта, сёння некаторая прадукцыя ў шэрагу захоўшчыкаў адсутнічае.

Так, напрыклад, ААТ «Новая Вілія» (Вілейскі раён), згодна са справаздачай, у лістападзе 2010 года заклала 16 тон цыбулі і мела 200 тон капусты. Аднак на пачатак лютага ў гаспадарцы не было ўжо ні першага, ні другога, пры тым, што рэалізавана было толькі каля 5 тон капусты і каля 4 тон цыбулі. Усё астатняе, па словах кіраўніка «Новай Віліі», згніла.

Месяц таму ўжо адсутнічала капуста і ў ААТ «Запольскае» (Чэрвеньскі раён), колькасць якой у лістападзе складала 50 тон. У акцыянерным таварыстве з 70 тон морквы засталося толькі тры тоны, а са 100 тон буракоў — адна!

Дзяржкантроль высветліў, што ў гэтых гаспадарках, ды і не толькі ў іх, адсутнічалі графікі рэалізацыі прадукцыі стабфондаў. Іншыя, хто графікі меў, іх не прытрымліваліся. У Барысаўскім раённым спажывецкім таварыстве на пачатак лютага мелася капусты толькі 30 працэнтаў ад графіка, у Дзяржынскім і Слуцкім — па 20 працэнтаў, Пухавіцкім — 12 працэнтаў, Вілейскім — 10 працэнтаў...

— Графікі рэалізацыі стабфондаў не з'яўляюцца жорсткімі, але яны своеасаблівыя індыкатары для ўпраўлення гандлем, — тлумачыў аглядальніку «Звязды» Максім Шэко. — Напрыклад, калі адно сховішча надта хутка расходуе прадукцыю, значыць, трэба браць агародніну ў іншым, каб прадукцыі хапіла да пачатку новага сезона. У нас жа атрымліваецца: адзін датэрмінова рэалізаваў, у другога — гніе. А ў выніку мы на пачатку вясны без уласнай капусты. Графікі павінны сігналізаваць пра тое, што трэба прымаць меры: дадаткова закупляць айчынную прадукцыю ў яе вытворцаў. А чыноўнікі сваім бяздзеяннем даводзяць сітуацыю да таго, што вобласць вымушана купляць дарагую замежную гародніну за валюту.

Адна з асноўных прычын датэрміновага скарачэння стабілізацыйных фондаў — парушэнне тэхналогіі захоўвання. Толькі ў вёсцы Старабарысаў (Барысаўскі раён) за 2 месяцы згніла амаль 77 тон капусты і 60 тон бульбы!



Фота КДК Мінскай вобласці.

**Капуста стабілізацыйных фондаў Дзяржынскага раённага спажывецкага таварыства. «Гэта — не самы горшы варыянт», — кажуць кантралёры.**

— Сельскагаспадарчы філіял Слуцкага мясакамбіната «Наша Ніва» захоўвае бульбу стабілізацыйнага і насеннага фондаў разам, навалам, без пераборкі, з зямлёй і смеццем, месцамі вільготную, — дакладаў на нарадзе Максім Шэко. — Падобным чынам захоўваюцца морква і буракі, тэмпературна-вільготны рэжым не вытрымліваецца, у памяшканні няма вентыляцыі, псіхрометраў. Верхні слой бульбы мае 20-30 сантыметровыя парасткі. На падлозе — вадкасць ад гнілі, на сценах — кандэнсат. Тут жа захоўваецца прарослая цыбуля, што з'яўляецца парушэннем усіх нормаў.

Не дзіўна, што пасля пераборкі гародніны «Наша Ніва» выкідае каля 30 працэнтаў бульбы, больш за 20 працэнтаў капусты, 12 працэнтаў буракоў, морквы і цыбулі. Тое, якой якасці трапляе беларуская гародніна пасля такога захоўвання на прылавак крамы, — тэма асобнай размовы.

У той жа «Нашай Ніве» тысяча тон прадукцыі раслінаводства была закладзена ў непрыдатнае для гэтага памяшканне, а ў тэхнічна абсталяванае, нядаўна рэканструяванае (коштам каля 3 млрд рублёў!) сховішча ААТ «Запольскае» (Чэрвеньскі раён) заклалі ўсяго толькі 100 тон. У лістападзе запольскае сховішча было запоўнена на чвэрць, а ў першыя дні лютага — на 0,6 працэнта.

— Штомесяц прадпрыемства плаціць 40 млн рублёў на ўтрыманне памяшканняў сховішча, — сказаў кіраўнік ААТ «Запольскае». — Мне зусім нявыгадна захоўваць гэтыя 14 тон стабфондаў.

Яшчэ адна прычына знікнення таннай беларускай агародніны ў крамах: скажэнні ў справаздачах. Восенню ўсё выглядала добра. Прынамсі, на паперы. Аднак у лютым на справе карціна аказалася зусім іншай. Вілейскае раённае спажывецкае таварыства мела ў стабфондзе каля 4 тон віртуальных яблык, Стаўбцоўскае — 6,5 тоны, Чэрвеньскае і Крупскае — 2,5 тоны, Дзяржынскае — 5 тон.

— Усё гэта вельмі сур'ёзна, — падкрэсліў кіраўнік Мінскага абласнога КДК, — гэтыя факты падрываюць харчовую бяспеку вобласці. Далей абмяжоўвацца папярэджаннямі і размовамі мы не маем маральнага права — неабходна апаратыўна прымаць меры.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

А да Расіі — сотні кіламетраў.




Помнік ахвярам Першай сусветнай.



# РУСКАЕ СЯЛО

## заўжды гатуе... дранікі

**РЭГУЛЯРНЫЯ перапісы насельніцтва на працягу многіх дзесяцігоддзяў даюць аднолькавы вынік: другой па колькасці прадстаўнікоў нацыянальнасцю ў нашай краіне традыцыйна застаецца руская. Таму сустрэць прадстаўніка гэтага народа зусім не складана. Але іншая справа — адшукаць, як здаецца на першы погляд, цалкам «рускую» вёску. Такая задача, — не з лёгкіх. Тым больш што знаходзіцца гэтая вёска ў Заходняй Беларусі — ці не за паўтысячы кіламетраў ад мяжы з Расійскай Федэрацыяй.**

Пры жаданні патрапіць у Рускае Сяло будзе вельмі проста — дастаткова «стаць» на трасу Вілейка—Смаргонь. Недзе праз два з паловай дзясяткі кіламетраў на ўзбочыне дарогі заўважаеш на ўзгорку вялікі помнік-крыж з выявай Хрыста Збаўцы. Помнік паставілі салдатам Расійскай імперыі, якія загінулі ў гэтых краях падчас Першай сусветнай вайны. Якраз насупраць помніка — і патрэбны ўказальнік. А неўзабаве за паваротам налева з'яўляецца сама вёска.

Сёй-той з мясцовых людзей лічыць, што некалі яе заснавалі выхадцы з Расіі. Але ў краязнаўцаў на гэты конт свая думка. Яны слушна заўважаюць, што само слова «сяло» — сведчанне тысячагадовай гісторыі вёскі. Ні асобнай рускай, ні беларускай нацыянальнасці на той час яшчэ не было. Затое існавалі, напрыклад, Чорная, Белая ці Чырвоная Русь. І вытокі цяперашняй назвы гэтага населенага пункта якраз адсюль.



**Яўгенія Шыбека: «Пельмені тут не робяць».**

Дарэчы, такі пункт гледжання ўскосна пацвярджае статыстыка. Ніводнага рускага ў вёсцы няма і кажуць, што не было аніколі. Усе мясцовыя жыхары — выключна беларусы. Адно праўда: рускасельцы (і менавіта так) заўсёды вызнавалі праваслаўе.

— Калі ў 1955 годзе я прыехала сюды пасля заканчэння сталічнай ВНУ і размеркавання, то вёска чамусьці адразу спадабалася, — распавядае былая настаўніца рускай мовы і літаратуры, цяперашняя пенсіянерка Яўгенія Іванаўна Шыбека. — Нельга сказаць, што жылі тут людзі надта багата, але і не бедна — ніхто не захапляўся гарэлкай, усе працавалі, трымалі гаспадарку.

А яшчэ ў Рускім Сяле была свая школа. Дзеля справядлівасці, яна лічылася ці не адзіным значным «аб'ектам», бо тыя ж клуб, ФАП, пошта і лазня з'явіліся ўжо пазней. Прычым у іх была сапраўдная патрэба — вёска лічылася вялікай, тут жыло пад 400 чалавек.

— Тэхнікі тады было мала, усе хадзілі ў саматканках, але ж жылі весела, — узгадвае Яўгенія Шыбека. — Часцяком пяклі пірагі. А вось рускія пельмені ніхто не рабіў. Наша фірмовая страва — беларускія дранікі.

Адной з асаблівасцяў Рускага Сяла заўсёды былі нетыпова вялікія для Вілейшчыны, па 80-100 гектараў, навакольныя палі. А плюс да таго вельмі добрая, урадлівая зямля — нездарма ў свой час тут месцілася панская сядзіба, «паны ўмелі выбіраць па-сапраўднаму добрае месца». Аднак часам спрыяльныя ўмовы для сельскай гаспадаркі становяцца не толькі «плюсам». Калі-нікалі яны ж адыгрываюць і зусім іншую ролю.

— Справа ў тым, што ў сярэдзіне 1970-х у блізкай адсюль вёсцы Нарач пабудавалі буйны свінагадоўчы комплекс, — кажа старшыня Нарачанскага сельсавета Анатоль Бяганскі. — Жывёле былі патрэбныя кармы, шмат збожжа, і тады звярнулі ўвагу на гэтыя багатыя землі. У выніку было прынята рашэнне аб рэарганізацыі мясцовага калгаса. Самастойны калгас «Рускасельскі», які традыцыйна лічыўся «моцным сярэдняком», спыніў існаванне і быў далучаны да суседніх гаспадарак.

Што было потым, здагадацца няцяжка. Неўзабаве Рускае Сяло пазбавілася статуса цэнтра сельсавета. А далей — больш. У вёсцы паступова зачыніліся сярэдняя школа, пошта, клуб. Цяпер тут засталіся толькі ФАП і прыватная крама. Уся іншая інфраструктура знаходзіцца за 5 кіламетраў, у вёсцы Нарач. У Нарачы ж стаіць і царква.

— З цягам часу змянілася шмат, нават стаўленне людзей да асабістых гаспадарак, цяпер многія ўжо не трымаюць тую ж свойскую жывёлу, — заўважае Анатоль Бяганскі. — І прычыны тут розныя. З аднаго боку, хтосьці проста пастарэў і мае «не тыя сілы». А з іншага боку — маладзейшыя, напэўна, не адчуваюць надта вялікай патрэбы. Наша сельгаспрадпрыемства «Нарачанскія зоры» не без падстаў лічыцца гаспадаркай моцнай: і з пасадкай бульбы ці збожжа дапаможа, і някепскія для вёскі заробкі налічыць, і выплаціць іх своечасова. Вось і атрымліваецца, што ўсё неабходнае з прадуктаў можна купіць у краме. І так сапраўды прасцей.

У сельгаспрадпрыемстве «Нарачанскія зоры» занятыя ці не ўсе працаздольныя рускасельцы. Альтэрнатывы ж фактычна няма. Да горада — далёка, развіццё якіх-небудзь напрамкаў бізнэсу мае не надта добрыя шанцы. Так, у гістарычным плане гэта мясціны вядомыя. На працягу 1915—1918 гадоў тут стаяў фронт, зусім побач — помнік ахвярам Першай сусветнай. Да помніка едзе шмат турыстаў. Але непасрэдна ў Рускім Сяле ніхто не затрымліваецца. Бо наўкол вёскі — толькі палі. Свайго лесу блізка няма.

— Напэўна, адсюль і адсутнасць турыстычнай цікавасці, — зазначае Анатоль Бяганскі. — Так, некаторыя рускасельцы, што ў свой час з'ехалі з вёскі, пасля выхаду на пенсію вырашаюць вярнуцца сюды зноў, хтосьці з гараджан купляе хаты для бацькоў-пенсіянераў. Аднак ажыятажу тут не назіраецца, дастаткова сказаць, што рынкавы кошт хаты цяпер складае ўсяго 2-3 тысячы «ўмоўных адзінак». І ўсё ж рабіць якія-небудзь сумныя высновы наконт будучыні Рускага Сяла не выпадае. У вёсцы жыве 116 чалавек, і з іх 71 знаходзіцца ў працаздольным узросце, а 18 — гэта дзеці і падлеткі. Словам, вёска жыве, і залічваць яе да катэгорыі «бесперспектыўных» яшчэ вельмі заўчасна.

**Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.**

*Вілейскі раён.*

Зваротная сувязь

# САМЫ ГАЛОЎНЫ САЦЫЯЛЬНЫ СТАНДАРТ — БЯСПЕКА ЛЮДЗЕЙ

**Супрацьпажарная бяспека стала асноўнай тэмай на прыёме грамадзян, які правёў міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА на ААТ «Магілёўхімвалакно».**

**Начальнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Магілёўхімвалакна» Віталь ПАНАМАРЭНКА** звярнуўся да міністра па тлумачэнні **наконт шляхоў эвакуацыі з будынкаў:** іх трэба прыводзіць у парадак у адпаведнасці з правіламі супрацьпажарнай бяспекі і на вялізных плошчах мяняць лінолеум на іншае менш гаручае пакрыццё, што патрабуе ад прадпрыемства вялікіх выдаткаў. Ці ёсць магчымасць адтэрмінаваць гэта да капітальнага рамонту?

— Нельга, — такі адназначны адказ Уладзіміра Вашчанкі. Бо патрабаванні да шляхоў эвакуацыі складаюцца з вопыту барацьбы з пажарамі і іх наступствамі.

— Людзі цяпер менш згараюць, а ўсё больш задыхаюцца, — патлумачыў міністр. — Цяпер у быце чалавека выкарыстоўваюцца такія хімічныя матэрыялы, што яны маюць усю табліцу Мендзялеева. Іх гарэнне стварае асяроддзе, непрыдатнае для дыхання чалавека. Некалькі хвілін дастаткова падыхаць, каб атруціцца.

Уладзімір Вашчанка ў сувязі з гэтым прыгадаў пажар у Крычаве: больш за дзясятак гадоў таму ў інтэрнаце загінулі людзі. Яны імкнуліся выратавацца, выходзілі на калідоры, глыталі таксічны дым і страчвалі прытомнасць. Частку з тых, каго вынеслі выратавальнікі, так і не ўдалося рэанімаваць.

Таму супрацьпажарныя нормы, якія, у прыватнасці, выпрацаваны ў дачыненні да шляхоў эвакуацыі, разумныя і скіраваны на тое, каб падчас пажару даць дадатковыя шанцы на выратаванне людзям. І грэбаваць імі, нягледзячы на вялікія выдаткі, нельга.

— Бяспека людзей павінна быць на першым месцы, — цвёрда сказаў міністр, прыгадаўшы пажар на «Пінскдрэве». — Кіраўніцтва абавязана клапаціцца пра бяспеку наперад прыбыткаў. І гэта датычыцца не толькі прадпрыемстваў, а, напрыклад, і аграгарадкоў. Спачатку трэба выканаць стандарт бяспекі людзей, а потым — усе астатнія сацыяльныя. Там, дзе няма бяспекі, утульнасць і прыгажосць неактуальныя.

Што датычыцца змен у заканадаўстве, то яны рыхтуюцца, паведаміў міністр, аднак датычыцца яны будуць спрашчэння адміністрацыйных працэдур па супрацьпажарнай бяспецы, а не самой бяспекі па сутнасці.

**Гаручымі матэрыяламі цікавілася работніца ААТ «Магілёўхімвалакно» Алена САЛТАНАВА.** Яе трывожаць паведамленні, у прыватнасці — з Расіі, пра гібель людзей у начных клубах і дамах састарэлых. Алена спыталася, ці плануецца абавязковае выкарыстанне матэрыялаў (не толькі будаўнічых, але, напрыклад, тканін), якія не гараць, асабліва ў месцах, дзе збіраецца вялікая колькасць людзей.

Уладзімір Вашчанка паведаміў, што беларускія прадпрыемствы распрацавалі і гатовы масава вырабляць самыя розныя негаручыя матэрыялы.

— Верагодна, што гэта будзе ўлічвацца пры ўдасканаленні нарматыўнай базы, — сказаў міністр. — Аднак ёсць і праціўнікі, бо выкарыстанне негаручых матэрыялаў — гэта справа нятанная. Безумоўна, МНС зацікаўлена ў іх выкарыстанні, бо выратавальнікі штодзень сутыкаюцца з бядой і гібеллю на пажарах. І дзякуй, што такая праблема хвалюе людзей. Гэта самае галоўнае.

**Алена КІРЫЛЮК, якая працуе намеснікам начальніка аддзела продажу хімічнай прадукцыі і спажывецкіх тавараў,** спыталася ў міністра пра **набыццё ў прадпрыемства «Магілёўхімвалакно» пажарных рукавоў.** Пытанне звязана з агульнай эканамічнай прасторай і з'яўленнем расійскіх канкурэнтаў у вытворчасці такой прадукцыі.

Уладзімір Вашчанка запэўніў, што МНС аддае перавагу айчынным вытворцам якаснай прадукцыі. Закупкі пажарных рукавоў у Магілёве ўжо перавысілі лічбу ў 3 мільярды рублёў. Аднак міністэрству хацелася б, каб і цэны на гэтую прадукцыі былі разумныя.

**Валерый ЯСНІЦКІ, які працуе на «Магілёўхімвалакне» ў галіне аховы працы,** пытаўся ў міністра МНС наконт **аптымізацыі колькасці байцоў супрацьпажарнай часці на прадпрыемстве.**

Уладзімір Вашчанка адказаў, што колькасць супрацоўнікаў супрацьпажарнай аховы не звязана са зменамі ў працоўным калектыве прадпрыемства, а разлічана на магчымыя пажары, якія давядзецца тушыць.

— Калі эканоміць на выратавальніках, можна страціць значна больш, — лічыць міністр па надзвычайных сітуацыях. — Вядома, цяпер кожны кіраўнік лічыць кожную капейку, але якраз тут нельга эканоміць. Бяспека каштуе шмат, але гэта сапраўды патрэбна.

У барацьбе з пажарамі таксама важна, паводле меркавання Уладзіміра Вашчанкі, свядомасць людзей. Некалькі дзясяткаў гадоў таму, расказаў ён, колькасць пажараў і іх ахвяр павялічвалася прыкладна на 10% у год. Гэтую тэндэнцыю выратавальнікам урэшце ўдалося пераламаць, але цяпер людзі, якія гінуць на пажарах, у асноўным не паддаюцца прафілактыцы. Большасць з ахвяр агню летась былі нецвярозымі ў момант гібелі. Таму міністр МНС заклікаў усіх людзей падключацца да справы супрацьпажарнай бяспекі, не эканоміць на гэтым і не шкадаваць сіл.

**Ілона ІВАНОВА.**

Падпіска-2011

# РАЗДАЧА ПАДАРУНКАЎ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Зараз у разгары падпісная кампанія на 2-гі квартал. А гэта азначае, што газета «Звязда» працягвае свае выезды ў рэгіёны з прызамі, якія выйгралі нашы падпісчыкі, а таксама паштальёны і кіяскёры ў рамках сумеснага конкурсу з РУП «Белпошта» і «Белсаюздрук».

Чарговы вояж быў прымеркаваны адразу ў дзве вобласці — Мінскую і Брэсцкую. Практычна ўвесь маршрут паездкі быў падарункавы. Калі Дзяржынск і Узду давялося наведаць у фармаце візіту ветлівасці з кароткачасовымі сустрэчамі на пошце і райвыканкаме, то Капыль стаяў асабняком. Яшчэ б: наша даўняя падпісчыца Ганна Васілеўская з вёскі Блеўчыцы выйграла кухонную машыну. Праўда, на сустрэчу са звяздоўцамі Ганна Іосіфаўна з-за вялікай занятасці прыйсці не змагла. Ды і не варта было засмучацца, бо напярэдадні нашай паездкі каштоўны прыз, што поўнасцю адпавядае Правілам розыгрышу, атрымала маладая жанчына Наталля — жонка яе ўнука Валерыя, які разам з сям'ёй жыве ў Мінску. У тэлефоннай размове з журналістам «Звязды» пенсіянерка, якая мае больш за 40 гадоў падпіснога стажу на старэйшае беларускамоўнае выданне, сказала, што вельмі шчаслівая такому падарунку.

Відавочна, што не менш шчаслівай адчувае зараз сябе і паштальён аддзела паштовай сувязі Астравечча Клецкага раёна Людміла Груша, якая выйграла пыласос «Віцязь». Праўда, у дзень нашага прыезду ў гэты рэгіён Міншчыны Людміла Уладзіміраўна была на працоўным месцы, таму ўручыць каштоўны прыз сваёй супрацоўніцы ўзяўся начальнік Клецкага РВПС Андрэй Сазановіч.

Далейшы маршрут ляжаў на Брэстчыну. На Ганцавіцкім раённым вузле паштовай сувязі намеснік начальніка Тамара Шуляк **(фота 1)** з задавальненнем сустрэла прадстаўнікоў газеты, якія прывезлі электрафен Заньковай Галіне — паштальёну АПС Дзяніскавічы. З улікам яе шчыльнага працоўнага графіка прыз звяздоўскаму лаўрэату ў самы бліжэйшы час будзе дастаўлены, запэўніла Тамара Адамаўна.




2

А вось начальнік суседняга, Ляхавіцкага РВПС Вольга Арэхва запрасіла падпісчыцу «Звязды» з вёскі Крывошын Ірыну Гатоўчыц на вузел сувязі, які знаходзіцца побач з плошчай насупраць райвыканкама. Менавіта на гэтай пляцоўцы, асветленае цёплым веснавым сонцам, прайшло ўручэнне каштоўнага прыза — каляровага тэлевізара «Віцязь» **(фота 2)**. Варта адзначыць, што Ляхавіцкі раён на гэты раз яшчэ «разжыўся» ад «Звязды» кухонным камбайнам, які выпаў жыхарцы раённага цэнтра Валянціне Пабягайла. Праўда, яна не дачакалася прыезду звяздоўцаў і атрымала каштоўны прыз напярэдадні ў рэдакцыі.

Вянцом цяперашняй паездкі стаў Баранавіцкі раён. На мясцовым РВПС намеснік начальніка Тамара Батура ўжо чакала нас. Дакладней, пыласос «Віцязь» для паштальёна АПС «Паланечка» Галіны Жукоўскай. Старшы інструктар Баранавіцкага вузла паштовай сувязі Святлана Швайдзюк **(фота 3)** адзначыла, што падарунак будзе ўручаны неабходнаму адрасату ў лічаныя дні.

Віншуем усіх звяздоўскіх лаўрэатаў з каштоўнымі прызамі. На наступным тыдні нас ужо будуць чакаць з падарункавай місіяй на Віцебшчыне.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

*Мінск — Дзяржынск — Узда — Капыль — Клецк — Ганцавічы — Ляхавічы — Баранавічы — Мінск.*



1



3

**«ПРЭМІРАВАННЕ» Ў АСАБЛІВА БУЙНЫМ ПАМЕРЫ**

**Больш за 200 мільёнаў рублёў украла за чатыры гады эканаміст аднаго з прадпрыемстваў Лідскага раёна, налічваючы «прэміі» выбранаму колу асоб, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Сярод іх былі выключна яе сваякі альбо знаёмыя, якія грошы ... не атрымлівалі, ды і наўрад ці здагадваліся, што іх банкаўскія пластыкавыя карткі выкарыстоўваюцца ў злачынных мэтах.

Удача пакінула жанчыну летась, калі рэвізія выявіла аферу. Заведзена крымінальная справа па факце крадзяжу грошай у асабліва буйным памеры шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі. Гэта караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**ЛОГОЗИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Медухово, участок № 8 кадастровый номер 623284503601000050 | 0,1789 га | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу | 6 440 400 | 644 040 | 1 681 104 |
| 2 | д. Старое Городище, участок № 6 кадастровый номер 623284506101000034 | 0,2226 га | Возможность подключения к водопроводу | 6 233 000 | 623 300 | 1 681 104 |
| 3 | д. Добренево, участок № 4 кадастровый номер 623284501101000112 | 0,0969 га | Электроснабжение, возможность подключения к водопроводу | 2 422 500 | 242 250 | 1 681 104 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600619091105 в ЦБУ № 611 филиала 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, МФО 153001601, УНН 600181551, Логозинский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 до 07.04.2011 г. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести оплату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. **Аукцион состоится 13.04.2011 г. в 10.00 по адресу: д. Логоза Логойского р-на, Минская обл., здание Логозинского сельского исполнительного комитета.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **07.04.2011 г.** по адресу: д. Логоза Логойского района, Минской области. Контактные телефоны: 8 01774 564 36, 564 98.

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету**

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ______ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

| ПВ | месца | літар |
|---|---|---|

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў |
|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | |

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ______ (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, пыласос, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **11 красавіка 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 20 красавіка 2011 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 31 чэрвеня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 31 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 01.03.11 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.03.11 па 30.06.11.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1859 ад 25.02.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2011 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______

Падпіска аформлена і аплачана ў ______ (аддзяленне сувязі)

______ на II кв. або 1–е паўг. 2011 года

Хатні адрас і тэлефон ______ (індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

## СЕРАДА, 16 САКАВІКА

### ПЕРШЫ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.40 Навіны.
6.05, 7.10, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.05, 8.10, 18.50, 1.45 Зона Х.
7.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.35 «Сфера інтарэсаў».
9.10, 19.55 **Серыял «Маргоша».**
10.00, 16.55 **Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
10.50, 17.50 **Серыял «Зацьменне».**
11.40 «Зямля беларуская». «Добруш. Горад мастоў».
12.10 **Меладрама «На мосце».**
14.05 «Акно ў Еўропу».
14.30 «Дастаеўскі. Бясстрашны прапаведнік Імя Хрыстовага».
15.15, 19.10 Навіны рэгіёна.
15.35 «OFF STAGE LIFE».
15.50 **Серыял «Жураў-2».**
19.25 «Спортлато 5 з 36».
19.30 «КЕНО».
19.35 Зямельнае пытанне.
21.00 «Панарама».
21.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. «Рэал» — «Ліон».
23.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. «Чэлсі» — «Капенгаген».
1.50 Дзень спорту.

### АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.10 **«Мая жонка мяне прываражыла». Серыял.**
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25 Навіны спорту.
11.10 «Смак».
11.50 **«Тата на ўсе рукі». Серыял.**
12.20 «Дэтэктывы».
13.10 «Кантрольная закупка».
13.45 «Модны прыгавор».
14.50 «Зразумець. Дараваць».
15.25 «Хачу ведаць».
16.15 **«Заручальны пярсцёнак». Серыял.**
17.05 **«Слова жанчыне». Серыял.**
18.20 **«Шчаслівыя разам». Серыял.**
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 **«Адплата». Серыял.**
22.20 **«След». Серыял.**
23.30 Асяроддзе пражывання.
0.30 **«Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Серыял.**
1.20 Начныя навіны.

### ЛАД

6.35, 22.35 **Серыял «Універ».**
7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 21.25 Тэлебарометр.
8.05 **Серыял «Інтэрны». Заключная серыя.**
8.35, 16.55 **Серыял «Чыста англійскія забойствы».**
9.35, 18.00 **Серыял «Ты маё жыццё».**
10.45 Дак. фільм «Міхаіл Рудый. Раман піяніста».
11.40 Спорт-кадр.
12.10 «Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
12.55 Урачэбныя тайны.
13.30 Урачэбныя тайны +.
13.45 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.50 **Серыял «Сіла прыцяжэння».**
15.45 Пазакласная гадзіна.
16.00, 23.45 **Серыял «Налётчыкі».**
19.05 Хакей. КХЛ. Плэй-оф. Паўфінал канферэнцыі «Захад». У перапынку : Калыханка.
21.30 Беларуская часінка.
23.15 Рэальны свет.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30, 20.25 **«Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.**
9.30 «Аўтапанарама».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 **«Трымай мяне мацней». Серыял.**
11.30 «Далёкія сваякі».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.30 **«Агонь кахання». Серыял.**
13.50 **«Дурні, дарогі, грошы». Серыял.**
14.40 **«Халасцякі». Серыял.**
15.30, 23.00 **«Хірамант 2». Серыял.**
16.50 «Новыя падарожжы дылетанта».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
21.30 «Мінск і мінчане».
22.05 «Скардзіцца дазволена».
23.55 **«Водбліскі». Серыял.**

### МІР

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 9.35 «Кыргызтан у асобах».
5.20 «Гісторыя стварэння».
6.05 «Цік-так».
6.20 «У гасцях у Вітамінкі».
7.05, 21.20 «Сакрэтныя матэрыялы».
7.35 **Серыял «33 квадратныя метры».**
08.05, 22.05 «Жывая гісторыя».
09.05, 18.30, 3.00 «Сардэчна запрашаем».
10.05 **Серыял «Рускія амазонкі».**
11.05, 3.30 **Маст. фільм «Мы жылі па суседстве».**
13.05 М/с «Рыцары магіі».
13.30 **Серыял «Старшакласнікі».**
14.05 **Серыял «Міліцэйская акадэмія».**
14.30 «Рэальныя гісторыі».
15.20 «Гісторыя стварэння».
16.05, 23.05 **Серыял «Вылечванне каханнем».**
18.20 «Акцэнты».
19.00, 2.00 **Серыял «Галіна».**
19.50, 1.05 Ток-шоу «Слова за слова».
20.45 «XX стагоддзе: найвялікшыя моманты гісторыі».

### 8 КАНАЛ

7.00, 10.55, 17.25, 19.40, 21.05, 23.50 «Надвор'е».
7.05, 17.30 **Серыял «Прытворшчык».**
8.00 **Серыял «Ракіроўка».**
9.00 «Адшукваецца адпачынак».
9.40, 16.00 Мультпарад.
10.00, 19.45 **Серыял «Горац».**
11.00 **Трылер «Вочы анёла».**
12.55, 15.40, 16.30 «Кінаблакнот».
13.15 **Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
15.15 «Сакрэтны палігон».
17.00 «K-відэа» для дзяцей.
18.25 Знаёмствы «Life».
18.40 **Серыял «Закаханы агент».**
20.50 «Вечарніца».
21.00 «K-відэа» для ўсёй сям'і.
21.10 **Камедыя «Высокі бландзін у чорным чаравіку».**
23.00 Еўрапейскі покер.

### ВТБ

6.00, 23.30 «PLAY».
8.00, 18.00, 23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 13.00, 20.00 **Серыял «Татавы дочкі».**
10.00, 15.00, 19.00 **Серыял «Кадэцтва».**
11.00, 14.00 **Серыял «Цуды. com».**
12.00 **Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
16.00 **Меладрама «Кветкі кахання».**
21.00 **Маст. фільм «Новыя рабінзоны».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
9.20, 18.50 **Серыял «Еўфрасіння».**
10.10 «Засакрэчаны герой Савецкага Саюза». Дак. фільм.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 17.20 **«Кулагін і партнёры».**
12.00, 20.30 **Серыял «Падарунак лёсу».**
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.25 «З новым домам!». Ток-шоу.
16.15 «Гарадок».
17.50 **Серыял «Пяць хвілін да метро».**
22.20 **Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».**
23.30 «Весткі.ru».
23.50 «Надзвычайны і паўнамоцны салавей. Полад Бюль-Бюль аглы». Дак. фільм.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20 Сёння.
6.10 «НТБ раніцай».
8.35 **Серыял «Таксістка».**
9.35, 15.35, 18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.20 «Дачны адказ».
11.20 «Развод па-руску».
12.10 «Да суда».
13.30 **Серыял «Гончыя».**
15.10 «Справа густу».
16.30 **Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
19.35 **Серыял «Мент у законе».**
21.35 **Серыял «Тэрмінал».**
23.45 «Справа цёмная».

### ТНТ

5.00 «Невытлумачальна, але факт».
6.00, 11.10 «Нікеладэон на ТНТ».
7.30, 1.00 **«10 прычын маёй нянавісці». Серыял.**
8.30, 18.00 **«Універ». Сітком.**
9.30, 13.00, 18.30 **Серыял «Шчаслівыя разам».**
10.40 М/с «Бэтмен: адважны і смелы».
13.30, 22.00, 3.30 «Дом-2».
15.20 **«Таксі-2». Камедыя.**
17.00, 19.00 **«Інтэрны». Сітком.**
17.30, 19.30 **Серыял «Рэальныя хлопцы».**
20.00 **Камедыя «Таксі-3».**
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
0.00 «Камедзі Клаб».
1.50 «Год Яа». Дак. фільм.
4.35 «Камедыянты».

### ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 З новай раніцай.
9.10, 5.10 Адзін у полі.
10.00, 0.10 Феерыя падарожжаў.
10.20, 16.30, 0.40 **Серыял «Простыя ісціны».**
10.50, 16.05, 1.05 **Серыял «Свая каманда».**
11.15, 20.35 **Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
12.15 Знак якасці.
12.45 **Маст. фільм «Злачынства і пакаранне».**
14.25 Дак. фільм «Заменнік смерці».
15.25, 23.30 Судовыя справы.
17.00, 2.15 **Серыял «Танга ўтраіх».**
17.45, 1.30 Ток-шоу «Здоровеньки булы».
18.30, 3.35 **Серыял «Агонь кахання».**
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
21.20 **Маст. фільм «Пазначаны атам».**
22.55 Праўда жыцця.
5.45 **Маст. фільм «Дарога нікуды».**

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.30, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
9.15, 18.45 Галоўная роля.
9.30, 0.50 Праграма перадач.
9.40 **«Рудзін». Маст. фільм.**
11.15 «Гіпербалоід інжынера Шухава». Дак. фільм.
11.55 «Чарлз Дарвін — свяшчэннаслужыцель д'ябла». Дак. фільм.
12.45 Легенды Царскага Сяла.
13.15 **«Справа Сухава-Кабыліна». Маст. фільм.**
14.15, 20.10, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
14.40 «Мах і Шэбестава на канікулах». М/с.
14.45 «Як казакі на вяселлі гулялі», «Была ў слана мара». М/ф.
15.15 **«Дзяўчынка з акіяна». Серыял.**
15.40 «Малпы-зладзюжкі». Дак. серыял.
16.05, 21.15 «Сталін і пісьменнікі».
16.30 «Ад ансамбля да аркестра».
17.35 Прыступкі цывілізацыі. «Залатая спіраль». Дак. фільм.
19.05 «Абсалютны слых».
19.45 Генералы ў цывільным. Леанід Кастандаў.
20.25, 0.55 Academia.
21.45 Магія кіно.
22.50 **«Стэла». Маст. фільм.**
0.35 Музычны момант.

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Званок у вячэрняй школе». Дак. фільм. 1988 год.
5.45 «Рытмічная гімнастыка». 1984 год.
6.30 «Клоўн». Тэлеспектакль. 1971 год.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 21.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
10.05 «Аднойчы вясной». Канцэрт. 1986 год.
11.00 «Яловая субмарына».
12.10 «Сядзі і глядзі». 1994 г.
12.25, 18.25 **«Ключ». Маст. фільм.**
13.35 «Гэта было, было...». Фільм-канцэрт. 1990 год.
16.05 «Аднойчы вясной». Канцэрт. 1986 год.
17.00 «Вясёлая моладзь». 1986 год.
22.05 «Я сама».
23.00 «Акулы пяра».
1.00 «Брэйн-рынг». 1990 год.
2.00 «Быў час».
3.00 «Тэатральныя сустрэчы». 8 сакавіка 1978 года.
4.30 «Пакуль усе дома». 1993 г.

### MTV

5.00, 2.25 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
7.30, 1.05 Шалёныя продкі.
7.55, 16.30 Свабодны.
8.25 **«Усё лепшае ў табе». Серыял.**
8.55, 1.30 Магія Крыса Энджэла.
9.20 Праўда жыцця: Я шукаю сваё дзіця.
10.10, 17.30 **«Ранеткі». Серыял.**
11.10, 18.30 Алена з поліпрапілену.
12.10 Хто круцейшы.
12.35, 22.50 News блок.
12.45, 21.30 **«Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.**
13.35, 22.25 **«Два з паловай чалавекі». Серыял.**
14.00, 23.00 **«Пляткарка». Серыял.**
14.50, 20.50 Індустрыя моды.
15.00, 21.00 **«Сквот». Серыял.**
15.30, 19.00 Каханне з першага погляду.
17.00 Зоркі на далоні.
20.00 «Подыум».
23.50 «Клініка».
0.15 Наступны.
0.40 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
1.55 Ікона відэагульняў.

### НАША КІНО

6.30, 12.30 Трагікамедыя «Прытулак камедыянтаў».
7.50, 13.50 Трагікамедыя «Празрыстае сонца восені».
8.30, 14.30 Драма «Абарыген».
10.40, 16.40 Драма «Злачынства лорда Артура».
18.30, 0.30 Драма «Пчолка».
20.30, 2.30 Камедыя «Палонныя ўдачы».
21.50, 3.50 Кінанавела «Нам не дадзена прадбачыць...».
22.30, 4.30 Драма «Паміраць не страшна».

### ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Казус Кукоцкага».
3.45 Маст. фільм «Палата № 6».
5.10 Камедыя «Ідэальны муж».
6.40 Трылер «Чаротавы рай».
8.10 Меладрама «Ён, яна і дзеці».
9.30 Камедыя «Формула кахання».
11.45 Камедыя «Падкідыш».
13.00 Дэтэктыў «Тайна «Чорных драздоў».
14.30 Маст. фільм «Апладысменты, апладысменты...».
15.50 Трагікамедыя «Вялікая пастка, або Сола для коткі пры поўні».
17.20 Меладрама «Падарожжа з хатнімі жывёламі».
19.45 Камедыя «Сваты».
22.05 Дэтэктыў «Мой пяшчотна любімы дэтэктыў».
23.30 Меладрама «Аповесць пра чалавечае сэрца».
1.45 Маст. фільм «Іван».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00, 15.00 Маст. фільм «Дзяцінства Цёмы».
6.20, 10.20, 14.20 М/с «Прышэлец Ванюша» № 2. Казкі народаў свету. «Браты Лю».
7.00, 11.00 М/с «Чарапашка-герой». Казкі замежных пісьменнікаў. «Храбры кравец».
8.00, 12.00 «Урокі цётачкі савы»: «Азбука-малышка». М/ф: «Сэрца храбраца», «Панцялей і пудзіла».
16.20 М/с «Ванюша і касмічны пірат» № 3. М/ф: «Наш добры майстар», «Дзядуля і ўнучак».
17.00 М/с «Чарапашка-герой». Казкі замежных пісьменнікаў. «Кот, які гуляў сам па сабе». М/ф «Зарадка для хваста».
18.00 «Урокі цётачкі савы»: «Геаграфія-малышка». М/ф «Блакітны шчанюк».

### ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Аэрапорт».
20.00, 2.00 Серыял «Шахматыст».
21.00, 3.00 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-5».
22.00, 23.30 Серыял «Соль зямлі».

### ТБ3

5.00 М/ф.
5.30, 1.00 «Альф». Серыял.
6.00, 1.30 Дзецям пра звераняк.
6.30, 15.30 «Як гэта зроблена».
7.00, 14.30 Разбуральнікі міфаў.
8.00, 2.00 Дак. фільм «Сучасныя цуды».
9.00, 18.00 «Менталіст». Серыял.
10.00, 19.00 «Гадзіннік кахання». Серыял.
11.00 Тайны стагоддзя.
12.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды».
12.30, 21.00 Маст. фільм «Джэк Хантар».
16.00, 3.00 «Уздзеянне». Серыял.
17.00 Дак. фільм «Мёртвая зона Аляксандра Кайданоўскага».
20.00 «Мяжа». Серыял.
23.00 «Чорная метка». Серыял.
0.00 «Вавілон-5». Серыял.
4.00 «Таямнічыя шляхі». Серыял.

### ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Серыял «Гоя».
10.05, 18.05, 2.05 Меладрама «Нашчадкі».
11.45, 19.45, 3.45 Драма «Віртуоз».
13.25, 21.25, 5.25 Трылер «Плецены чалавек».
15.10, 23.10, 7.10 Камедыя «Даследуючы прыроду сэксу».

### 12.10 ФІЛЬМ ДНЯ

**«НА МОСЦЕ» (РАСІЯ — УКРАІНА, 2007 г.)**

Вадзім Сямёнаў — генеральны прадзюсар аднаго з найбуйнейшых тэлеканалаў краіны, паспяховы менеджар і проста добры чалавек. Але нават у такога добрага чалавека ёсць свой «шкілет у шафе». І, як высвятляецца, не адзін.



**Рэжысёр** — Іван Сауткін. **У ролях:** Аляксандр Цюцін, Ксенія Князева, Сямён Фурман, Канстанцін Кастышын, Міхаіл Барніч.

### ТБ1000

3.10, 21.00 Драма «Адстрэльваючы сабак».
5.10 Меладрама «Бландзінка з амбіцыямі».
7.00 Драма «Зоркі пад месяцам».
9.00 Камедыя «Сямейная справа».
11.00 Камедыя «Дабіся поспеху».
13.00 Драма «О».
15.00 Драма «Спявак».
17.00 Камедыя «Шэсць жонак Генры Лефэя».
19.00 Драма «Дарфур: Хронікі аб'яўленай смерці».
23.00 Драма «Ачышчэнне».
1.00 Драма «Аферыст».

### DIVA UNIVERSAL

5.00, 3.20 Серыял «Вайна Фойла».
6.40, 12.30, 18.20 Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
7.35 Маст. фільм «Муж напракат».
9.15 За камерай.
10.50, 23.15 Серыял «Джордан расследуе».
11.40, 19.10 Серыял «Пляткарка».
13.25 Камедыя «Жонкі, пра якіх ён забыў».
15.00 Маст. фільм «З памадай на вуснах».
16.40 Серыял «Міласэрнасць».
17.30 Серыял «Тры ракі».
20.00 Серыял «Шпік».
21.35 Маст. фільм «Пацалуй нявесту».
0.10 Маст. фільм «Прызнанне экзатычнай танцоўшчыцы».
1.50 Маст. фільм «Дамашнія гульні».

### РАМАНТЫКА

7.00, 16.55, 21.20, 5.20 «Тайна Лауры».
7.55, 10.40, 20.30 «Стол на траіх».
8.50, 14.10, 0.55 «Ніколі не позна?».
9.45, 15.05, 3.35 «Сямейныя вузы».
11.30, 17.45, 2.40 «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
12.25, 1.50, 6.10 «Жанчыны на сцежцы вайны».
13.20, 23.05, 4.30 «Дора на варце парадку».
16.00, 19.35, 22.10 «Дасканалая прыгажосць».
0.00 «Дона Флор і два яе мужы».

### AXN-SciFi

0.10, 10.05, 18.30 4400.
0.50, 6.25, 19.15 Мёртвая зона.
1.35, 3.30, 5.45, 13.00 Зорны крэйсер Галактыка.
2.10, 13.45, 23.45 Бліч.
2.45, 4.15, 9.20 Чалавек-невідзімка.
5.00, 12.10, 17.45 Зорныя вароты.
7.10, 14.15 Звышнатуральнае.
7.50, 15.00, 22.15 Чорная лагуна.
10.45, 16.15 Дзённікі вампіра.
20.00 Кайл XY.
21.30 Тайны Смалвіля.

### EUROSPORT

9.30 «Алімпійскія гульні».
10.00, 2.00 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету сярод легкавых аўтамабіляў.
10.30, 12.30, 18.15 Горныя лыжы. Кубак свету.
11.30 Біятлон. Чэмпіянат свету.
13.25, 19.35 Футбол. Еўрагалы.
13.30, 22.00 Тэніс. Турнір WTA.
16.45, 1.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
19.30 Горныя лыжы. SKI Girls.
19.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў сярод жанчын.
23.30 «Спартыўнае падарожжа».
23.35 Выбранае па серадах.
23.40 Навіны коннага спорту.
23.45 Гольф. CA Championship.
0.45 Гольф-клуб.
0.50 Яхт-клуб.

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Небяспечныя сустрэчы.
6.00, 14.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
7.00, 12.00 Інжынерныя ідэі.
8.00, 13.00 Мегазаводы.
9.00, 15.00 На кручку.
10.00, 16.00 Самыя неверагодныя імгненні.
11.00, 19.00, 4.00 Рэальнасць або фантастыка?
11.30, 19.30, 4.30 Секунды да катастрофы.
17.00 Горшыя турмы Амерыкі.
18.00 Верталётныя баталіі.
20.00, 23.00, 2.00 Калі кракадзілы елі дыназаўраў.
21.00, 0.00, 3.00 Паранармальнае.
22.00 Забароны.
1.00 Крытычная сітуацыя.

### DISCOVERY

7.00, 14.45 «Пятая перадача».
7.25, 12.00, 18.00 Мегабудоўлі.
8.20, 19.00, 0.00, 5.10 Як працуюць машыны.
8.50, 19.30, 0.30, 5.40 Як гэта працуе.
9.15, 15.15, 3.50 Разбуральнікі легенд.
10.10 «Галаваломы».
11.05 Выжыць любой цаной.
12.55, 20.00, 1.00 «Top Gear».
13.50 Махінатары.
16.10 Брудная работка.
17.05 Лесапавал на балотах.
21.00, 2.00 У пагоні за ўраганам.
22.00 Мужчына, жанчына, прырода.
23.00 Рачныя монстры.
4.45 «Маланкавыя катастрофы».

### TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 20.00, 1.00 Сусветны падарожнік.
6.00 Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
7.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
8.00 Смак Іспаніі.
8.30 Індыйскі баль.
9.00 Антарктыда.
9.30 Падарожжы сёння.
11.00, 16.00 Галівуд і віно.
11.30, 16.30 Падарожжы па месцах вінаробства.
12.00, 4.00 Вясна.
12.30, 19.00, 0.00 Цудоўныя падарожжы вачамі відавочцы з Варунам Шармай.
13.30, 4.30 Аўстралійскія падарожжы.
15.00 Флойд у Афрыцы.
15.30 Сафі Грыгсан на ўсходнім базары.
18.00, 23.00 Сафі Грыгсан у графствах Радзімы.
18.30, 23.30 Насустрач мастацтву.
22.00, 3.00 Лыжны свет.
22.30, 3.30 Серфары.

### ANIMAL PLANET

7.00 Вуліца лемураў.
7.25, 16.30 «Будні дэльфінаў».
7.50 Планета малых.
8.40, 17.00 Усё пра сабак.
9.10, 6.10 «Котак не любіць нельга».
10.05, 19.15 «Заатур Мікаэлы».
11.00 Тэрыторыя жывёл.
11.55 «SOS дзікай прыроды».
12.50 Апошні шанц.
13.45 «Шатландскае таварыства абароны жывёл».
14.10 Ветэрынары-стажоры.
14.40, 0.45 «Лёсы шымпанзэ».
15.30, 20.10 Перакладчык з сабачай.
17.25 «Незвычайныя сабакі».
17.50 Коткі Кло-Хіл.
18.20 Незвычайныя жывёлы Ніка Бэйкера.
21.05, 2.35 Падарожжа даўжынёй у жыццё.
22.00, 3.30 Тыя, хто ваюе са шкоднікамі.
22.55, 4.25 У пошуках гіганцкай анаконды.
23.50, 5.20 Дзікія і небяспечныя.
1.40 Уводзіны ў сабаказнаўства.

### ЗДАРОЎЕ

5.00, 11.40, 16.10, 20.00, 2.40 Набалелае пытанне.
5.50, 20.50 Я расту.
6.30, 21.30 Сакрэты здароўя.
6.55, 13.30, 21.55, 4.30 Кабінет прыгажосці.
7.35, 22.35 Ты тое, што ты ясі.
8.00, 12.30, 3.30 Энцыклапедыя памылак.
8.30, 23.00 Цяга да жыцця.
9.20, 23.50 Цела чалавека.
9.50, 0.50 Выдаткі вытворчасці.
10.30 Панацэя.
11.00, 2.00 Практыка здароўя.
12.45, 3.45 Азбука здароўя.
12.50, 3.50 Клінічны гіпноз.
14.00 Правілы здароўя.
14.35 Дзіцячая медыцына.
15.00 Вялікая прабежка.
15.40 Гісторыя хвароб.
17.00 Як не страціць здароўе.
17.40 Жаночы часопіс.
18.20 Колькі вам гадоў?
18.50 Я перамог гэты боль.
19.30 Дзіця нарадзілася.
1.10 Дыялогі пра харчаванне.

### ТДК

6.00, 7.50, 16.55, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 15.00, 22.20 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 23.30, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
13.00 Нашы дзеці.
14.00 Маю права.
19.00, 22.30, 4.00 Люстэрка жыцця.
21.00, 0.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
1.00 «Клубнічка».
3.00 Гісторыя поспеху.

## ЧАЦВЕР, 17 САКАВІКА

### ПЕРШЫ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.50 Навіны.
6.05, 7.10, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.05, 8.10, 18.50, 0.50 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.35 Зямельнае пытанне.
9.10, 19.55 **Серыял «Маргоша».**
10.05, 16.55 **Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
11.00, 17.50 **Серыял «Зацьменне».**
12.10 **Меладрама «Споведзь Дон Жуана».**
14.00 Дак. фільм «Невядомая версія. «Афіцэры».
15.15, 19.10 Навіны рэгіёна.
15.35 «Зброя».
15.50 **Серыял «Жураў-2».**
19.25 «КЕНО».
19.30 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 **Серыял «Падмані мяне-2».**
22.55 «Эпоха». «Зоркі 61-га Берлінскага кінафестывалю».
0.00 «Зброя будучыні».
0.55 Дзень спорту.

### АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.20 **«Мая жонка мяне прываражыла». Серыял.**
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25 Навіны спорту.
11.10 «Смак».
11.50 **«Тата на ўсе рукі». Серыял.**
12.20 «Дэтэктывы».
13.10 «Кантрольная закупка».
13.45 «Модны прыгавор».
14.50 «Зразумець. Дараваць».
15.25 «Хачу ведаць».
16.15 **«Заручальны пярсцёнак». Серыял.**
17.05 **«Слова жанчыне». Серыял.**
18.20 **«Шчаслівыя разам». Серыял.**
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 **«Адплата». Серыял.**
22.20 **«След». Серыял.**
23.30 Паядынкі. «Вярбоўшчык».
1.25 Начныя навіны.

### ЛАД

6.35 **Серыял «Універ».**
7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 20.25 Тэлебарометр.
8.05 **Серыял «Чыста англійскія забойствы».**
9.00, 18.00 **Серыял «Ты маё жыццё».**
10.10 Жансавет.
10.45 «Бітва экстрасэнсаў».
11.55 Біятлон. Фінал Кубка свету-2011. Спрынт. Жанчыны.
13.15 Дача здароўя.
13.50 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.50 Пазакласная гадзіна.
15.10 Біятлон. Фінал Кубка свету-2011. Спрынт. Мужчыны.
16.30 Лабірынты: каханне Максіма Багдановіча.
17.00 **Серыял «Налётчыкі».**
19.05 «Смешныя людзі».
20.05 «Калыханка».
20.30 Беларуская часінка.
21.35 «Халі-галі». Скетч-шоу.
22.00, 0.20 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/8 фіналу.
0.00 Час футбола.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30, 20.25 **«Пятроўка, 38. Каманда Пятроўскага». Серыял.**
9.30 «Скардзіцца дазволена».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 **«Трымай мяне мацней». Серыял.**
11.30 «Далёкія сваякі».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.30 **«Агонь кахання». Серыял.**
13.50 **«Дурні, дарогі, грошы». Серыял.**
14.40 **«Халасцякі». Серыял.**
15.30, 23.00 **«Хірамант 2». Серыял.**
16.50 «Прывітанне, доктар!».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
21.30 «Праўда».
22.05 «Аўтапанарама».
23.55 **«Водбліскі». Серыял.**

### МІР

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 9.35 «Садружнасць LIVE».
5.20, 15.20 «Культурны слой з Львом Лур'е».
6.05 «Цік-так».
6.20 «У гасцях у Вітамінкі».
7.05 «Сардэчна запрашаем».
7.35 **Серыял «33 квадратныя метры».**
8.05, 22.05 «Жывая гісторыя».
9.05, 18.30 «Тут быў я».
10.05 **Серыял «Рускія амазонкі».**
11.05, 3.00 **Маст. фільм «Яшчэ не вечар».**
13.05 М/с «Рыцары магіі».
13.30 **Серыял «Старшакласнікі».**
14.05 **Серыял «Міліцэйская акадэмія».**
14.30 «Адкрытая размова».
16.05, 23.05 **Серыял «Вылечванне каханнем».**
18.20 «Акцэнты».
19.00, 2.00 **Серыял «Галіна».**
19.50, 1.05 Ток-шоу «Слова за слова».
20.45 «XX стагоддзе: найвялікшыя моманты гісторыі».
21.20 «Дыяспары».

### 8 КАНАЛ

7.00, 10.55, 16.55, 17.25, 18.35, 19.40, 21.05, 23.45 «Надвор'е».
7.05, 17.30 **Серыял «Прытворшчык».**
8.00 **Серыял «Ракіроўка».**
9.00 «Падарожжа са смакам».
9.30, 16.00 Мультпарад.
10.00, 19.45 **Серыял «Горац».**
11.00 **Камедыя «Гудзонскі ястраб».**
12.55, 15.40, 23.25 «Кінаблакнот».
13.15 **Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
15.15 «Сакрэтны палігон».
16.30 «Аповеды пра жывёл».
17.00 «Мой любімы гадаванец».
18.40 **Серыял «Закаханы агент».**
20.50 «Вечарніца».
21.00 «К-гульні». «Лайт».
21.10 **Трылер «Рэгенезіс».**
23.10 Знаёмствы «Life».

### ВТБ

6.00, 23.15 «PLAY».
8.00, 18.00, 22.45 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 13.00, 20.00 **Серыял «Татавы дочкі».**
10.00, 15.00, 19.00 **Серыял «Кадэцтва».**
11.00, 14.00 **Серыял «Цуды. com».**
12.00 **Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
16.00 **Маст. фільм «Новыя рабінзоны».**
21.00 **Камедыя «Стыльныя штучкі».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
9.20, 18.50 **Серыял «Еўфрасіння».**
10.10 «Містэрыя жыцця. Народны мастак Ілья Глазуноў». Дак. фільм.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 17.20 **«Кулагін і партнёры».**
12.00, 20.30 **Серыял «Падарунак лёсу».**
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.25 «З новым домам!». Ток-шоу.
16.15 «Гарадок».
17.50 **Серыял «Пяць хвілін да метро».**
22.20 **Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».**
23.30 «Весткі.ru».
23.50 «Паядынак».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
6.10 «НТБ раніцай».
8.35 **Серыял «Таксістка».**
9.35, 15.35, 18.40 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.20 «Баль на ўвесь свет».
11.20 «Таямнічая Расія».
12.05 «Да суда».
13.30 **Серыял «Гончыя».**
15.10 «Справа густу».
16.25 **Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
19.50 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Зеніт» (Расія) — «Твентэ» (Галандыя).
21.55 **Серыял «Мент у законе».**
23.55 «Вочная стаўка».

### ТНТ

5.00 «Невытлумачальна, але факт».
6.00, 11.10 «Нікеладэон на ТНТ».
7.30, 1.00 **«10 прычын маёй нянавісці». Серыял.**
8.30, 18.00 **«Універ». Сітком.**
9.30, 13.00, 18.30 **Серыял «Шчаслівыя разам».**
10.40 М/с «Бэтмен: адважны і смелы».
13.30, 22.00, 3.55 «Дом-2».
15.20 **«Таксі-3». Камедыя.**
17.00, 19.00 **«Інтэрны». Сітком.**
17.30, 19.30 **Серыял «Рэальныя хлопцы».**
20.00 **Камедыя «Таксі-4».**
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
0.00 «Наша Russia».
1.50 **«Не кажыце маме, што нянька здохла». Камедыя.**

### ІНТЭР+

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 З новай раніцай.
9.10, 5.10 Адзін у полі.
9.55, 0.10 Феерыя падарожжаў.
10.20, 16.30, 0.40 **Серыял «Простыя ісціны».**
10.50, 16.05, 1.05 **Серыял «Свая каманда».**
11.15, 20.35 **Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
12.15 Знак якасці.
12.45 **Маст. фільм «Пазначаны атам».**
14.15 **Маст. фільм «Дарога нікуды».**
15.25, 23.30 Судовыя справы.
17.00, 2.15 Сямейны суд.
17.45, 1.30 Ток-шоу «Здоровеньки булы».
18.30, 3.35 **Серыял «Агонь кахання».**
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
21.20 **Маст. фільм «Маналог».**
23.00 Легенды крымінальнага вышуку.
5.45 **Маст. фільм «Ні пуху, ні пер'я».**

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.30, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
9.15, 18.45 Галоўная роля.
9.30, 0.50 Праграма перадач.
9.40 **«Кветкі запаздалыя». Маст. фільм.**
11.15 «Надламанае жыццё. Сямён Надсан».
11.55 «Залатая спіраль». Дак. фільм.
12.45 «Стагоддзе Рускага музея».
13.15 **«Справа Сухава-Кабыліна». Маст. фільм.**
14.40 «Мах і Шэбестава на канікулах». М/с.
14.45 «Як казакі іншапланецян сустракалі», «Гісторыя пра дзяўчынку, якая наступіла на хлеб». М/ф.
15.15 **«Дзяўчынка з акіяна». Серыял.**
15.40 «Малпы-зладзюжкі». Дак. серыял.
16.05, 21.15 «Сталін і пісьменнікі».
16.35, 1.40 «Сусветныя скарбы культуры».
16.50 «У вашым доме».
17.35 Прыступкі цывілізацыі. «Сонечны камень — компас вікінгаў». Дак. фільм.
19.00 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
19.40 «Два жыцці. Наталля Макарава». Дак. фільм.
20.25, 0.55 Academia.
21.40 Культурная рэвалюцыя».
22.50 **«Год, калі мае бацькі паехалі ў водпуск». Маст. фільм.**
0.35 Р. Шуман. Уверцюра, скерца і фінал.

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Яловая субмарына».
6.10 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
6.25, 12.25 **«Ключ». Маст. фільм.**
7.35 «Гэта было, было...». Фільм-канцэрт. 1990 год.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
09.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.05, 4.05 «Аднойчы вясной». Канцэрт. 1986 год.
11.00 «Вясёлая моладзь». 1986 год.
16.05 «Я сама».
17.00 «Зорная гадзіна». 1993 г.
17.50 «Чалавек і закон». 1988 г.
18.30 **«Гэтыя розныя, розныя, розныя твары». Маст. фільм.**
22.05 «Тэма». 1991 год.
23.00 «Званок у вячэрняй школе». Дак. фільм. 1988 год.
23.45 «Рытмічная гімнастыка». 1984 год.
0.30 «Клоўн». Тэлеспектакль. 1971 год.

### MTV

5.00, 2.25 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
7.30, 1.05 Шалёныя продкі.
7.55, 16.30 Свабодны.
8.25 **«Усё лепшае ў табе». Серыял.**
8.55, 1.30 Магія Крыса Энджэла.
9.20 Праўда жыцця: Я еду за каханым чалавекам.
10.10, 17.30 **«Ранеткі». Серыял.**
11.10 Буду нараджаць.
12.10 Праверка чутак.
12.35, 22.50 News блок.
12.45, 21.30 **«Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.**
13.35, 22.25 **«Два з паловай чалавекі». Серыял.**
14.00, 23.00 **«Пляткарка». Серыял.**
14.50, 20.50 Індустрыя моды.
15.00, 21.00 **«Сквот». Серыял.**
15.30, 19.00 Каханне з першага погляду.
17.00 Зоркі на далоні.
18.30 «Алена з поліпрапілену».
20.00 «Подыум».
23.50 «Клініка».
0.15 Наступны.
0.40 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
1.55 Гарачае кіно.

### НАША КІНО

6.30, 12.30 Драма «Пчолка».
8.30, 14.30 Камедыя «Палонныя ўдачы».
9.50, 15.50 Кінанавела «Нам не дадзена прадбачыць...».
10.30, 16.30 Драма «Паміраць не страшна».
18.30, 0.30 Кінараман «Абрыў».
20.50, 2.50 Маст. фільм «Жыццё Аляксандра Неўскага».
22.30, 4.30 Маст. фільм «Узарванае пекла».

### ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Казус Кукоцкага».
3.45 Драма «Гульні матылькоў».
5.30 Камедыя «Вяселле з пасагам».
7.15 Меладрама «Ксенія, любімая жонка Фёдара».
8.40 Маст. фільм «Тэатр».
11.45 Камедыя «У знак пратэсту!».
13.10 Меладрама «Перад іспытам».
14.15 Маст. фільм «Кожны дзень доктара Калінніковай».
15.45 Маст. фільм «Пастка».
16.50 Камедыя «Чатыры таксісты і сабака-2».
19.45 Камедыя «Сваты-2».
21.45 Драма «Мы, ніжэйпадпісаныя».
0.05 Маст. фільм «Пасол Савецкага Саюза».
1.35 Камедыя «Акселератка».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Дзяцінства Цёмы».
6.20, 10.20, 14.20 М/с «Ванюша і касмічны пірат» № 3. М/ф: «Наш добры майстар», «Дзядуля і ўнучак».
7.00, 11.00 М/с «Чарапашка-герой». Казкі замежных пісьменнікаў. «Кот, які гуляў сам па сабе». М/ф «Зарадка для хваста».
8.00, 12.00 «Урокі цётачкі савы»: «Геаграфія-малышка». М/ф: «Блакітны шчанюк», «Казка старога дуба».
15.00 Камедыя «У адно цудоўнае дзяцінства».
16.10 М/с «Ванюша і велікан» № 4. М/ф: «Як страціць вагу?», «У краіне нявывучаных урокаў», «А што ты ўмееш?».
17.00 М/с «Чарапашка-герой». М/ф «Капрызная прынцэса». «Як стары квактухай быў».
18.00 «Урокі цётачкі савы»: «Геаграфія-малышка». М/ф «Чарадзейныя ліхтарыкі».

### ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Аэрапорт».
20.00, 2.00 Серыял «Шахматыст».
21.00, 3.00 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-5».
22.00, 23.30 Серыял «Соль зямлі».

### ТБ3

5.00 М/ф.
5.30, 1.00 «Альф». Серыял.
6.00, 1.30 Дзецям пра звераняк.
6.30, 15.30 «Як гэта зроблена».
7.00, 14.30 Разбуральнікі міфаў.
8.00, 2.00 Дак. фільм «Сучасныя цуды».
9.00, 18.00 «Менталіст». Серыял.
10.00, 19.00 «Гадзіннік кахання». Серыял.
11.00 Тайны стагоддзя.
12.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды».
12.30, 21.00 Маст. фільм «Джэк Хантар».
16.00, 3.00 «Уздзеянне». Серыял.
17.00 Дак. фільм «Віктар Авілаў. Гіпноз д'ябла».
20.00 «Мяжа». Серыял.
23.00 «Чорная метка». Серыял.
0.00 «Вавілон-5». Серыял.
4.00 «Таямнічыя шляхі». Серыял.

### ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Драма
10.50, 18.50, 2.50 Камедыя «Яна ненавідзіць мяне».
13.15, 21.15, 5.15 Баявік «Гульня па-буйному».
15.05, 23.05, 7.05 Трылер «Макбет».

### ТБ1000

3.00, 21.05 Драма «Апошні бой».
5.00 Драма «Дарфур: Хронікі аб'яўленай смерці».
7.00 Драма «О».
9.00 Драма «Спявак».
11.00 Камедыя «Шэсць жонак Генры Лефэя».
13.00 Трагікамедыя «Залатая моладзь».
15.00 Камедыя «Смерць ёй да твару».
17.00 Камедыя «Скотланд, Пенсільванія».
19.00 Драма «Гульні д'ябла».
23.10 Драма «Аферыст».
1.00 Камедыя «Непрыбраныя пасцелі».

### 12.10 ФІЛЬМ ДНЯ

**«СПОВЕДЗЬ ДОН ЖУАНА» (УКРАІНА, 2008 г.)**

Дон Жуан памірае. Урач адпусціў яму апошні дзень жыцця. Дон Жуан хоча паспавядацца і адпусціць свае грахі. Ніхто са святароў не хоча выслухаць вядомага ўсёй Іспаніі грэшніка. Згаджаецца толькі малады манах. І менавіта яму лёс даў магчымасць даведацца пра тайну...



**Рэжысёр** — Андрэй Бенкендорф. **У ролях:** Надар Мгалоблішвілі, Арцём Ткачэнка, Васіль Баша, Алена Фесуненка.

### DIVA UNIVERSAL

5.00, 3.15 Серыял «Вайна Фойла».
6.40, 12.30, 18.20 Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
7.35 Маст. фільм «Правасуддзе па-тэхаску».
9.10 Маст. фільм «У пагоні за лёсам».
10.50 Серыял «Джордан расследуе».
11.40, 19.10 Серыял «Пляткарка».
13.25 Маст. фільм «Галівудскія жонкі».
15.00 Маст. фільм «Дамашнія гульні».
16.40 Серыял «Шпік».
20.00 Серыял «Тры ракі».
20.50 Серыял «Міласэрнасць».
21.40 Серыял «Добрая жонка».
22.30 Камедыя «Лёгкае захапленне».
0.00 Маст. фільм «Адкрыты дом».
1.40 Маст. фільм «Пацалуй нявесту».

### РАМАНТЫКА

7.00, 16.55, 21.20, 5.20 «Тайна Лауры».
7.55, 10.40, 20.30 «Стол на траіх».
8.50, 14.10, 0.55 «Ніколі не позна?».
9.45, 15.05, 3.35 «Сямейныя вузы».
11.30, 17.45, 2.40 «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
12.25, 1.50, 6.10 «Жанчыны на сцежцы вайны».
13.20, 23.05, 4.30 «Дора на варце парадку».
16.00, 19.35, 22.10 «Дасканалая прыгажосць».
0.00 «Дона Флор і два яе мужы».

### AXN-SciFi

0.10, 10.00, 18.35 4400.
0.55, 6.25, 19.15 Мёртвая зона.
1.40, 3.30, 5.45, 13.00 Зорны крэйсер Галактыка.
2.25, 13.40, 23.45 Бліч.
2.50, 4.15, 9.15 Чалавек-невідзімка.
5.00, 12.10, 17.45 Зорныя вароты.
7.10, 14.05, 21.30 Тайны Смалвіля.
7.55, 14.50, 22.20 Чорная лагуна.
10.45, 16.15 Кайл XY.
20.00 Палтэргейст.

### EUROSPORT

9.30 Тэніс. Турнір WTA.
10.30, 13.15 Горныя лыжы. Кубак свету.
11.30, 14.30 Біятлон. Чэмпіянат свету.
12.00, 15.00, 19.10, 0.30 Біятлон. Кубак свету.
14.25 Горныя лыжы. SKI Girls.
16.30 Скачкі з трампліна. Кубак свету.
17.30, 21.45 Снукер. «Players Tour Championship».
19.00 Футбол. Еўрагалы.
20.00 Тэніс. Турнір WTA.
2.00 Мультыспорт.

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Вялікія міграцыі.
6.00, 14.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
7.00, 12.00 Калі кракадзілы елі дыназаўраў.
8.00, 13.00 Паранармальнае.
9.00, 15.00 На кручку.
10.00, 16.00 Самыя неверагодныя імгненні.
11.00, 19.00, 4.00 Рэальнасць або фантастыка?
11.30, 19.30, 4.30 Секунды да катастрофы.
17.00 Горшыя турмы Амерыкі.
18.00 Верталётныя баталіі.
20.00, 23.00, 2.00 Зграя.
21.00, 0.00, 3.00 У пошуках акул.
22.00 Забароны.
1.00 Крытычная сітуацыя.

### DISCOVERY

7.00, 14.45 «Пятая перадача».
7.25, 12.00, 18.00 Мегабудоўлі.
8.20, 19.00 Як працуюць машыны.
8.50, 19.30, 0.30, 5.40 Як гэта працуе.
9.15, 15.15, 3.50 Разбуральнікі легенд.
10.10, 2.55, 6.05 «Галаваломы».
11.05 Выжыць любой цаной.
12.55, 20.00, 1.00 «Top Gear».
13.50 Махінатары.
16.10 Брудная работка.
17.05 Амерыканскі порт.
21.00, 2.00 Зброя будучыні.
22.00 На мяжы.
23.00 Выжыць у катастрофе.
0.00, 5.10 Патрабуецца зборка.
4.45 «Маланкавыя катастрофы».

### TRAVEL

5.00, 9.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00 Сусветны падарожнік.
6.00 Цудоўныя падарожжы вачамі відавочцы з Варунам Шармай.
7.00 Сафі Грыгсан у графствах Радзімы.
7.30 Галівуд і вінаград.
8.00 Смак Іспаніі.
8.30 Індыйскі баль.
11.00, 16.00 Галівуд і віно.
11.30, 16.30 Падарожжы па месцах вінаробства.
12.00, 4.00 Вясна.
12.30 Раскошныя падарожжы з Варунам Шармай.
13.30, 4.30, 22.30, 3.30 Серфары.
15.00 Флойд у Афрыцы.
15.30 Сафі Грыгсан на ўсходнім базары.
18.00, 23.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
19.00, 0.00 Індыйскі час.
20.00, 1.00 Мараплаўцы.
22.00, 3.00 Лыжны свет.

### ANIMAL PLANET

7.00 Вуліца лемураў.
7.25, 16.30 «Будні дэльфінаў».
7.50 Пандамоніум.
8.40, 17.00 Усё пра сабак.
9.10, 6.10 «Незвычайныя сабакі».
9.35, 6.35 Коткі Кло-Хіл.
10.05, 19.15 «Заатур Мікаэлы».
11.00 Тэрыторыя жывёл.
11.55 «SOS дзікай прыроды».
12.50 Паліцыя Філадэльфіі — аддзел па абароне жывёл.
13.45 «Шатландскае таварыства абароны жывёл».
14.10 Ветэрынары-стажоры.
14.40, 0.45 Дзікі эскадрон.
15.30, 20.10 Перакладчык з сабачай.
17.25, 1.40 Уводзіны ў сабаказнаўства.
18.20 Падарожжа даўжынёй у жыццё.
21.05, 2.35 Паляўнічы на яд.
22.00, 3.30 На волю з пітбулем.
22.55, 4.25 Я не павінен быў выжыць!
23.50, 5.20 Дзікія і небяспечныя.

### ЗДАРОЎЕ

5.00, 12.25, 20.00, 3.25 Правілы здароўя.
5.35, 20.35 Дзіцячая медыцына.
6.00, 21.00 Вялікая прабежка.
6.40, 21.40 Гісторыя хвароб.
7.10, 17.40, 22.10 Набалелае пытанне.
8.00, 23.00 Пазнай сябе.
8.40, 23.40 Будзем здаровыя.
9.20, 10.20, 12.20, 18.45, 1.20, 3.20 Азбука здароўя.
9.25 Калі ежа забівае.
10.25, 1.25 Не выходзячы з дому.
11.00, 2.00 Пра дыеты і не толькі.
11.40, 2.40 Выкрыццё прадуктаў.
12.50, 3.50 Школа розуму.
13.30, 4.30 Курс лячэння.
14.00 Як не страціць здароўе.
14.40 Жаночы часопіс.
15.20 Колькі вам гадоў?
15.50 Я перамог гэты боль.
16.30 Дзіця нарадзілася.
17.00 Практыка здароўя.
18.30 Энцыклапедыя памылак.
18. 50 Клінічны гіпноз.
19.30 Панацэя.
0.20 Ты тое, што ты ясі.

### ТДК

6.00, 7.50, 12.50, 14.10, 16.55, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 15.00, 22.20 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 23.30, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
13.00 Філасофія здароўя.
13.30 Нашы дзеці.
14.30 Маю права.
19.00, 22.30, 4.00 Люстэрка жыцця.
21.00, 0.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
1.00 «Клубнічка».
3.00 Гісторыя поспеху.

# Краіна здароўя

Выпуск № 12 (248)

Прафілактыка

## ЯК ВЫБРАЦЬ ЗУБНУЮ ПАСТУ?

**НА паліцах крам можна сустрэць вялікую разнастайнасць зубных паст айчыннай і замежнай вытворчасці. І нават калі арыентавацца толькі на іх цану, зрабіць правільны выбар самастойна вельмі складана.**

### КРУГЛАСУТАЧНАЯ ЗАСЦЯРОГА

Нярэдка рэкламуюцца зубныя пасты, якія засцерагаюць ад бактэрый на працягу 24 гадзін. У гэтым выпадку гаворка ідзе пра сродкі з трыклазанам — антысептыкам, які валодае антыбактэрыяльнай і супрацьзапаленчай уласцівасцямі і перашкаджае ўтварэнню зубнога налёту.

Сам па сабе трыклазан дастаткова хутка выводзіцца з поласці рота. Таму для падаўжэння яго дзеяння ў склад зубной пасты ўводзіцца палімер, які фіксуе трыклазан на паверхні зубоў на працягу 12 гадзін. І калі зубы чысціць два разы ў дзень, атрымліваецца, што на працягу 24 гадзін трыклазан знаходзіцца ў поласці рота.

Як і іншыя сродкі гігіены, якія ўтрымліваюць антысептыкі, зубныя пасты з трыклазанам не рэкамендуецца выкарыстоўваць пастаянна працяглы час. Курс іх прымянення — не больш за месяц, каб пазбегнуць развіцця дысбактэрыёзу поласці рота.

### А ЯК НА СМАК?

Практычна ўсе зубныя пасты для дарослых маюць свежы смак дзякуючы ўвядзенню ў іх склад аддушак — ментолу, эфірных алеяў мяты, шалфею, эўкаліпту і інш. Гэтыя кампаненты абавязковыя — яны надаюць зубной пасце прыемны смак і водар, а таксама маскіруюць непрыемны смак асобных яе складнікаў.

Варта адзначыць, што ступень адчування свежасці пасля чысткі зубоў нічога не гаворыць пра якасць самой чысткі. Ачышчэнню ад налёту аддушкі не дапамагаюць, аднак эфірныя раслінныя алеі аказваюць антыбактэрыяльнае і супрацьзапаленчае дзеянне.

### АСВЕТЛІМ?

Адбельвальныя зубныя пасты — найбольш папулярныя сродкі для асвятлення зубоў у хатніх умовах. Існуе некалькі разнавіднасцяў такіх паст.

● Адбельвальныя зубныя пасты з утрыманнем ферментаў. Такія пасты маюць мяккі паліравальны эфект. Пасты з ферментамі прызначаныя для тых, каму супрацьпаказана прафесійнае адбельванне зубоў: пры наяўнасці сцірання цвёрдых тканак зубоў, эрозій эмалі, павышанай адчувальнасці зубоў або вялікай колькасці пломбаў. Пры выкарыстанні гэтых пастаў эмаль асвятляецца на 1—2 тоны. Пасты з ферментамі бяспечныя для дзяснаў і эмалі і могуць выкарыстоўвацца курсам: двойчы ў дзень на працягу аднаго—двух месяцаў.

● Высокаабразіўныя зубныя пасты. Яны прызначаныя для тых, хто шмат курыць, у вялікай колькасці п'е моцную гарбату або каву, у выніку чаго на зубах утвараецца цёмны налёт. Гэтыя пасты асвятляюць зубы за кошт высокага ўтрымання абразіўных часціц. Прымяняць іх можна не часцей аднаго—двух разоў у тыдзень, інакш эмаль сціраецца і зубы становяцца занадта адчувальнымі.

● Адбельвальныя зубныя пасты, якія ўтрымліваюць перакіс вадароду або карбаміду. Гэтыя злучэнні з'яўляюцца крыніцамі атамарнага кіслароду. Апошні разбурае пігменты, якія надаюць эмалі жаўтаватае адценне. Перакісныя злучэнні ў больш высокіх канцэнтрацыях выкарыстоўваюцца для прафесійнага адбельвання зубоў — яго праводзіць стаматолаг. Хоць такія зубныя пасты прадстаўлены на нашым рынку, выкарыстоўваць іх лепш пад наглядам стаматолага. Бескантрольнае прымяненне падобных сродкаў можа прывесці да разбурэння эмалі і развіцця карыесу, павышэння адчувальнасці зубоў і запалення дзясны. Пры наяўнасці пломбаў іх колер можа адрознівацца ад колеру зуба.

Таксама памятайце, што адбельвальныя зубныя пасты не рэкамендуецца выкарыстоўваць дзецям да 14 гадоў, калі працэс фарміравання эмалі яшчэ не завершаны.

Лепш за ўсё, каб зубную пасту, якая падыходзіць менавіта вам, падабраў урач-стаматолаг пасля агляду поласці рота.

### АЙЧЫННАЯ АБО ЗАМЕЖНАЯ?

Цана зубной пасты — не апошні крытэрый пры яе выбары. Цана можа залежаць ад вытворцы і кошту інгрэдыентаў, што ўваходзяць у склад пасты. Як правіла, зубныя пасты мясцовых вытворцаў маюць ніжэйшую цану, але па эфектыўнасці не саступаюць замежным аналагам.

Бяспечныя для ўжывання тыя сродкі гігіены, якія прайшлі лабараторныя і клінічныя выпрабаванні і маюць сертыфікат адпаведнасці. Таму набываць зубныя пасты лепш за ўсё ў аптэках.

### З ЧАГО СКЛАДАЮЦЦА ЗУБНЫЯ ПАСТЫ?

Амаль усе сучасныя зубныя пасты — лячэбна-прафілактычныя. Гэта значыць, служаць не толькі для механічнага ачышчэння зубоў ад налёту пры дапамозе абразіўных кампанентаў, але і садзейнічаюць прафілактыцы і лячэнню захворванняў зубоў і поласці рота (карыесу, хвароб парадонта, дзяснаў). Для гэтага ў іх склад уводзяцца розныя актыўныя кампаненты.



● **Фтарыды і злучэнні кальцыю** — для прафілактыкі карыесу зубоў і ўзнаўлення структуры эмалі.

● **Экстракты лекавых раслін,** эфірныя алеі, антысептыкі (хлоргексідын, трыклазан) — для зняцця запалення дзяснаў (кровачачывасці, ацёку), а таксама для змяншэння ўтварэння зубнога налёту.

● **Солі калію, стронцыю, гідраксіяпатыт** — для зніжэння адчувальнасці зубоў. Яны змяншаюць болевую рэакцыю на розныя раздражняльнікі: тэмпературныя і хімічныя (гарачае, халоднае, кіслае, салодкае), механічныя (чыстку зубоў).

● **Ферменты** (папаін, лізацым, лактаферын і інш.) могуць выкарыстоўвацца ў зубных пастах для павышэння эфектыўнасці выдалення налёту або антымікробнага дзеяння. Таксама мэтазгодным з'яўляецца прымяненне зубных пастаў з утрыманнем ферментаў пры ксерастаміі (сухасці ў роце).

● **Злучэнні цынку і алюмінію** перашкаджаюць асаджэнню фарбавальных рэчываў на паверхню эмалі і запавольваюць хуткасць фарміравання зубнога каменю. Зубныя пасты, якія ўтрымліваюць такія злучэнні, звычайна рэкамендуюцца курцам і прызначаюцца пасля прафесійнай чысткі зубоў.

● **Вітаміны А, Е, С, групы В, караталін** — для паляпшэння абменных працэсаў, паскарэння загойвання слізістай абалонкі рота.

Многія зубныя пасты аказваюць комплекснае дзеянне. Гэта значыць, утрымліваюць кампаненты, якія садзейнічаюць прафілактыцы і лячэнню адразу некалькіх стаматалагічных захворванняў. Напрыклад, у іх прысутнічаюць фтарыды для прафілактыкі карыесу і экстракты лекавых раслін — для лячэння запалення дзяснаў.


## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ЛОТ 1

| Наименование объекта | Краткая характеристика |
|---|---|
| Здание автостанции «Остримо» | Здание специализированное автомобильного транспорта инв. № 422/С-3776, литер Е1/к,1977 г.п., общая площадь здания 313,4 кв.м, объем здания с подвалом 1485 м.куб., фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная, полы дощатые, цементные, отопление – чугунные радиаторы, электроснабжение – скрытая электропроводка. Сарай Литер 2, 1977 г.п., площадь застройки 62 кв.м,объем 186 м.куб., фундамент бетонный,стены и перегородки кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная, полы бетонные, электроснабжение – скрытая электропроводка. Проезжая часть с дорожным бордюром – асфальтобетонное покрытие площадью 4595,4 кв.м,бетонный бордюр длиною 441,6 м. Пешеходная часть с тротуарным бордюром – тротуарная плитка(бетон) площадью 275,6 кв.м, бетонный бордюр длиною 206,6 м. Зеленые насаждения (28 ед.) |
| Начальная цена продажи | 72 889 605 белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 7 288 960 белорусских рублей |
| Местонахождение объекта | Гродненская обл., Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 49 |
| Земельный участок | Кадастровый № 425856600002000070, общая площадь земельного участка – 0,7343 га, назначение – содержание и обслуживание зданий и строений автостанции |
| Продавец | Филиал «Автомобильный парк № 12 г. Щучин» ОАО «Гроднооблавтотранс» г. Щучин, ул. Советская, 41 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34 |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк» код банка 152101705, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 14 апреля 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 каб. 209**

К участию в аукционе допускаются юридические лица,физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 13 апреля 2011 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Міжсезонне

Да ведама

## ХАРЧУЕМСЯ БЕЗ ПАМЫЛАК

**10 памылак робіць сучасны чалавек, калі харчуецца. Так сцвярджае каментатар нямецкага тэлебачання Ханс Моль, кніга якога «Сем праграм здароўя» паражыла нябачаны пік папулярнасці ў Еўропе. Пры яе падрыхтоўцы аўтар выкарыстоўваў матэрыялы даследаванняў навуковых установ Германіі і ЗША.**

### МЫ...

**...ядзім вельмі шмат.** Ніякі гараджанін не кампенсуе фізічнай працай тую энергію, якую атрымлівае з ежай. Звычка аб'ядацца за святочным сталом — нож у вашу падстраўнікавую залозу і печань.

**...ядзім занадта тлустую ежу.** У сярэднім чалавек штодзень ужывае 140 г тлушчу пры норме 80 г. Ежа бедная на вітаміны, клятчатку. Мы ядзім вельмі шмат мучных вырабаў, піражных і тартоў.

**...няправільна выбіраем ежу.** Замест аб'ёмных, сытных, але нізкакаларыйных і нятлустых агародніны і садавіны мы ядзім так званую «звычайную» ежу, цяжкую і высокакаларыйную.

**...п'ём ежу.** Амаль усе сучасныя напоі каларыйныя — чай і кава з цукрам, алкаголь, газіроўка, кактэйлі. Дзясятая частка (у сярэднім 330 ккал) атрыманых на працягу дня калорый — «вадкія» калорыі.

**...не захоўваем рэжым харчавання.** Хаатычнае паяданне ежы на хаду, між іншым, калі захацелася «закрыць» паўзу, характарызуе наша невуцкае стаўленне да працэсу прыняцця ежы.

**...перабіраем з ласункамі.** Апошнія ўносяць дысбаланс у наш абмен рэчываў. Нам нельга есці больш як адзін кавалак цукру ў суткі, а мы ядзім у сярэднім дзесяць (у выглядзе цукерак і іншых дэсертаў).

**...злоўжываем прадуктамі доўгага захоўвання.** Мы перасольваем іх, перабіраем з кансервантамі і вяндлінай. Ежа, якая доўга захоўваецца, — шкодная.

**...любім сябе заахвочваць.** Працэс ужывання ежы даўно ператварыўся ў акт псіхафізіялагічнага ўраўнаважвання. Калі вы задаволеныя сабой, вы ясце. Калі вам дрэнна, вы заядаеце праблему, каб даставіць сабе задавальненне.

**...мала ведаем пра сапраўдныя патрэбы арганізма.** Мы недастаткова чытаем пра гэта і яшчэ менш прыслухоўваемся да ўласнага «біялагічнага гадзінніка». Пры гэтым вельмі мала ведаем пра каларыйнасць ежы, утрыманне ў ёй бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, вітамінаў, мікраэлементаў.

**...ядзім, забываючы пра ўзрост.** Меню для 20-гадовага чалавека не можа быць такім жа, як для 50-гадовага. Пры складанні рацыёну харчавання варта ўлічваць узрост, стан здароўя, рытм жыцця і прывычныя нагрузкі.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Яна + Ён

## ДАВЯДЗІ ЯГО ДА КІПЕННЯ,

### або ТОП-10 жаночых звычак, якія могуць разбурыць любыя адносіны і стаць прычынай для расставання

**10 Уяўная дабрадзейнасць.** Вельмі многія дзяўчаты ў спрэчках выкарыстоўваюць аргументы з серыі «ты пачвара, я святая». Пры гэтым самі яны ніколі не прызнаюцца ў тым, што, адказваючы на адпаведнае пытанне, разоў у пяць скарацілі спіс сваіх «былых». Той жа, хто раскрые мужчыну вочы на сапраўднае становішча рэчаў, рызыкуе нажыць у асобе такой дзяўчыны лютага ворага. Таму больш за ўсё цэняцца не тыя мілыя дамы, якія спрабуюць здавацца лепшымі, чым яны ёсць, а на самай справе вартыя. Ніхто не забараняе вам мець мноства палюбоўнікаў у сваім паслужным спісе, але тады давядзецца шукаць мужчыну, які нармальна да гэтага паставіцца і якому не трэба будзе хлусіць.

**9 Крытыка іншых жанчын.** «Няўжо так цяжка сказаць камплімент прадстаўніцы аднаго з табой полу?» — здзіўляюцца мужчыны. Калі дзяўчына, якая вам сустрэлася, сапраўды добра выглядае, вы зарабляеце дадатковыя балы, пахваліўшы яе густ. Але калі раптам вы заўважаеце, што — о жах! — у красуні справа ад вас туфлі не падыходзяць па колеры да сумачкі, пра гэта лепш прамаўчаць. Калі ўжо зусім сіл нестае — можна абмеркаваць гэта пазней з сяброўкамі.

**8 Рэўнасць да кожнага слупа.** Не толькі мужчыны часам ператвараюцца ў Атэла — жанчыны таксама здольныя атруціць жыццё сваім спадарожнікам рэўнасцю, асабліва беспадстаўнай. Часта нават узгаданае ў гутарцы чужое жаночае імя можа выклікаць цэлую буру эмоцый. Што ўжо казаць пра паход з сябрамі ў стрыптыз-бар — за такое, трэба думаць, адразу належыць расстрэл. Калі вы ніводнага разу не лавілі свайго чалавека на хлусні, то варта расслабіцца і не ўпадаць у параною. А калі ж у вашага мужчыны рыльца ў пуху — добра падумайце, ці патрэбен ён вам такі. У супрацьлеглым выпадку давядзецца цярпець мукі рэўнасці пастаянна.

**7 Паталагічная несамастойнасць.** Уласна, гэта нават несамастойнасцю назваць складана. Проста такім жанчынам трэба, каб іх мужчына пастаянна знаходзіўся побач, здзімаў з іх пылінкі і пастаянна паўтараў, як яму пашанцавала з другой палавінкай. Яны ператвараюць свайго спадарожніка ў эмацыйную «мыліцу», звяртаючыся па падтрымку любога роду ў любых сітуацыях. Не, мужчыны, безумоўна, гатовыя прыйсці на дапамогу, але большасць з іх мяркуюць, што са зламаным пазногцем жанчына здольная разабрацца сама, максімум — з дапамогай манікюркі.

**6 Пытанні «Ты мяне кахаеш?».** Незадавальненне гэтай «мукай», бадай, мае самую багатую гісторыю. Нас, дзяўчат, таксама можна зразумець: трэба ж ведаць, як да цябе ставіцца чалавек, з якім ты хочаш звязаць сваю будучыню. Аднак самі мужчыны расцэньваюць такія пытанні, як самую сапраўдную экзэкуцыю. Калі ён кахае, то скажа пра гэта сам, а калі не, то вы абое апынацецеся ў няёмкім становішчы.

**5 Уварванне ў асабістую прастору.** Жанчыны «пакутуюць» ад гэтага пастаянна, хоць самі за сабой шчыра гэтага не заўважаюць. Ну як не спытаць у каханага, хто гэта яму званіў — а раптам разлучніца? А куды гэта ён сабраўся? На футбол з сябрамі? Хм... Пазней пачынаюцца вобыскі кішэняў і асабістых рэчаў, і — класіка жанру — чытанне SMS у яго тэлефоне. Уявіце сябе на месцы свайго маладога чалавека: вам вельмі і вельмі не спадабалася б падобнае ўмяшанне.

**4 Празмерная эмацыянальнасць.** Меладрама, няўдалая стрыжка, сукенка, якую «адбілі» з-пад носа ў краме, — ці шмат прычын трэба дзяўчыне, каб адчуць сябе самай нешчаслівай на свеце і кінуцца ў слёзы. У саміх слязах няма нічога саромнага, куды горш настойлівае патрабаванне спачування з боку мужчыны. А для яго гэтыя праблемы выедзенага яйка не вартыя. І як суцяшаць у падобных выпадках, ён не вельмі разбіраецца. Да таго ж жаночых слёз мужчыны баяцца, а тое, чаго чалавек баіцца, ён звычайна стараецца пазбягаць — гэта значыць, ён проста ўхіліцца ад твайго жыцця.

**3 Шопінг да страты пульсу.** Гэта вы ведаеце, што на складанне прыгожага гардэробу часу не шкадуюць. І нерваў — у сезон распродажу лёгка ўпусціць тое, у чым вы ў думках ужо прагульваецеся па набярэжных на курорце. Дык вось, самай вялікай памылкай будзе браць свайго маладога чалавека на «штурм» магазінаў. Мужчыны не любяць «цягацца» па гандлёвых цэнтрах на прадмет «паглядзець», паколькі пачынаюць думаць пра тое, колькі карыснага яны маглі б зрабіць за гэтыя некалькі гадзін — ды хоць бы проста паваляцца перад тэлевізарам.

**2 Балбатлівасць.** На пытанне «Як прайшоў твой дзень?» мужчына разлічвае пачуць штосьці накшталт «нармальна» і пару-тройку цікавых выпадкаў, калі яны былі. Аднак да споведзі на гадзіну ён не гатовы. Пашкадуй вушы свайго чалавека і не стамляй яго пералічваннем шпілек, якія вы з калегамі адпускалі ў адрас боса за кубачкам кавы.

**1 Сэксуальны шантаж.** Гэта адно з самых распаўсюджаных пакаранняў, якое жанчыны прымяняюць да сваіх партнёраў. Калі мужчына кахае вас да бяспамяцтва, то «налева» ён наўрад ці пойдзе. Так і будзе пакутаваць ад вашай непрыступнасці. Падумайце, можа, лепш паспрабаваць усё растлумачыць словамі, чым прымушаць мучыцца самага блізкага вам чалавека?

Дзіцячая тэма

## АЗЫ ХАТНЯЙ ФІЗІЯТЭРАПІІ

**БЕЗУМОЎНА, займацца самалячэннем нельга — гэта пацвердзіць любы ўрач. Але бываюць сітуацыі, калі неадкладны зварот да доктара немагчымы. Тады першую медыцынскую дапамогу захварэламу дзіцяці даводзіцца аказваць самім бацькам. Акрамя лекаў, якія даказалі сваю эфектыўнасць «у мінулы раз», яны часта выкарыстоўваюць розныя сродкі хатняй фізіятэрапіі.**

### Ліхаманка — калі і як з ёй змагацца?

Страх высокай тэмпературы ў малога, які прастудзіўся, пераследуе большасць бацькоў. Некаторыя баяцца яе проста панічна — збіваюць нават тады, калі паказчыкі тэрмометра крыху вышэйшыя за норму. І дарэмна. Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя тэмпературу ніжэй за 38,0 °С лепш не збіваць — пры такой адзнацы ў арганізме пачынаюць актыўна выпрацоўвацца антыцелы і імунаглабуліны, якія дапамагаюць змагацца з вірусамі і інфекцыямі. Выключэнні з гэтага правіла датычацца дзяцей з родавымі траўмамі, неўралагічнымі праблемамі і тых, у каго хаця б аднойчы былі сутаргі пры павышэнні тэмпературы. У такіх выпадках тэмпературу варта зніжаць ужо пры 37,5—37,8 °С.

Другая распаўсюджаная памылка бацькоў у барацьбе з ліхаманкай — адначасовае выкарыстанне медыкаментаў і фізіяпрацэдур. Даюць гарачкапаніжальны сіроп і пачынаюць абціраць малога або абгортваць. Гэта небяспечна, бо тэмпература цела можа ўпасці занадта хутка і рэзка, а наступствы ад такіх перападаў адаб'юцца на арганізме карапуза не лепшым чынам.

### Ніякай гарэлкі — толькі вада і воцат!

Для зніжэння гарачкі ўжываюцца абціранні, кампрэсы і абгортванні.

● **Водныя абціранні.** Пры абціраннях адбываецца механічнае раздражненне скуры, паляпшаецца крываток, а значыць, і цеплааддача. Ні ў якім разе не выкарыстоўвайце для гэтай працэдуры халодную ваду з-пад крана. З-за вельмі халоднай вады можа адбыцца павярхоўны спазм сасудаў, праз якія ажыццяўляецца цеплааддача, — у выніку тэмпература ў малога не знізіцца, а, наадварот, пачне яшчэ больш паднімацца і лакалізавацца ва ўнутраных органах. Пры тэмпературы цела 38—39 °С тэмпература вады для абцірання павінна быць 30—32 градусы — гэта значыць крыху цяплейшая за пакаёвую. Набярыце ў ёмістасць вады, вазьміце некалькі сурвэтак (фланелевых або баваўняных), намачыце іх у вадзе. Адцісніце адну і абатрыце спачатку ручкі і ножкі (ад перыферыі да цэнтра). Калі сурвэтка сагрэецца, пакладзіце яе ў ваду, вазьміце другую, разатрыце грудзі, жывоцік, спінку і попу.

● **Спіртавыя абціранні.** Катэгарычна забароненыя для маленькіх дзяцей! Нягледзячы нават на самыя «пераканаўчыя» гісторыі з досведу старэйшых пакаленняў (гэта значыць бабуль і дзядуляў)! Выкарыстанне спірту або гарэлкі для абціранняў (а таксама абгортванняў і кампрэсаў) малых небяспечна. Скура дзіцяці гіграскапічная: усё, што аказваецца на яе паверхні, умомант усмоктваецца і трапляе ў кроў. У медыцынскай практыцы нямала выпадкаў, калі маленькія пацыенты траплялі ў бальніцы з высокай тэмпературай і прыкметамі алкагольнага ап'янення пасля абгортванняў са спіртам. Пасля такога «лячэння» яшчэ і вельмі верагодныя апёкі на далікатнай дзіцячай скуры. Выснова: пакуль дзіцяці не споўніцца 12 гадоў, ніякіх «моцных» вадкасцяў у хатняй фізіятэрапіі.

● **Воцатныя абціранні.** А вось дабаўленне воцату ў ваду цалкам апраўдана і бяспечна. Воцат хутка выпарваецца з паверхні скуры — дзякуючы гэтаму цеплааддача паскараецца, і тэмпература падае хутчэй, чым пасля воднага абцірання. Тэхніка і паслядоўнасць абцірання тыя ж, што і з вадой. Толькі ўлічвайце важныя нюансы. Па-першае, разводзіць 6-працэнтны воцат у вадзе трэба ў прапорцыі 1 ст. лыжка на 1 літр вады (многія, не ведаючы гэта, робяць занадта канцэнтраваны раствор). Па-другое, неабходна сачыць, каб воцат не трапіў у вочы дзіцяці.

● **Гарачкапаніжальныя абгортванні.** Гэтаксама, як і з абціраннямі, можна выкарыстоўваць проста ваду або ваду з дабаўленнем воцату (прапорцыі тыя ж).Толькі тэмпература іх павінна быць крыху ніжэйшай — 28°С. Засцяліце пасцель цыратай, затым — сухой пялюшкай. Намачыце пялёнку або прасціну і абгарніце дзіця вільготнай тканінай, пакінуўшы свабоднымі кісці і ступні. Зверху ўхутайце сухой пялёнкай і коўдрай. На ножкі надзеньце баваўняныя шкарпэткі, таксама намочаныя ў вадзе, а на іх — шарсцяныя. Працягласць абгортванняў — 50—60 хвілін. Пасля працэдуры пажадана абмыць малога, каб змыць пот і разам з ім таксіны, якія паспелі выдзеліцца праз скуру. Улічыце: абгортванні супрацьпаказаныя дзецям з неўралагічнымі праблемамі, дэрматытам, інфекцыйнымі захворваннямі скуры, а таксама сутаргамі.

● **Гарачкапаніжальныя кампрэсы.** Кампрэсы — гэта «маленькія», лакальныя абгортванні. Іх можна рабіць незалежна ад іншых працэдур, а можна і сумяшчаць з імі. Напрыклад, абціраючы цела малога адной сурвэткай, вы кладзяце другую, трэцюю на лоб, або ў падпаху, або пад каленку — туды, дзе праходзяць буйныя сасуды. Замест сурвэткі падыдзе і пузыр з лёдам (замарожаная ў пластыкавай бутэльцы вада) — яго лепш класці ў падкаленныя ямкі. Аналагічным чынам можна выкарыстоўваць і звычайныя кубікі лёду, сабраныя ў поліэтыленавы пакет. Толькі прыкладваць усё гэта варта праз тканіну (напрыклад, складзеную ў чатыры разы тонкую пялёнку) і не больш як на 30 хвілін. Будзьце ўважлівыя: у месцах накладання кампрэсу ў малога не павінна быць ніякіх скурных праблем. І калі вы ўбачыце, што скура пад кампрэсам рэзка збляднела, неадкладна спыніце працэдуру.

**Увага!** *Усе апісаныя гарачкапаніжальныя працэдуры добрыя толькі пры так званай «чырвонай» ліхаманцы: пры высокай тэмпературы ў дзіцяці чырванее скура, ручкі і ножкі вельмі гарачыя. Пры «белай» жа ліхаманцы (нягледзячы на высокую тэмпературу, малога «марозіць», у яго халодныя кісці і ступні, бледная «мармуровая» скура, носагубны трохвугольнік сінюшны) падобныя працэдуры рабіць нельга — дзіця трэба не ахалоджваць, а саграваць.*

### Сагравальныя працэдуры

● **Грэлка.** Яе часцей за ўсё выкарыстоўваюць менавіта пры «белай» ліхаманцы або ў тых выпадках, калі ў хворага малога імкліва звалілася тэмпература і з'явіліся дрыжыкі. Аптымальны варыянт — пакласці цёплую грэлку пад ножкі дзіцяці. Справа ў тым, што ступні рэфлекторна звязаныя з верхнімі дыхальнымі шляхамі, таму іх праграванне паляпшае кровазварот у гэтай вобласці, а ахаладжэнне, адпаведна, пагаршае.

● **Праграванні носа.** Гэтыя працэдуры не такія бяскрыўдныя, як здаецца. Калі ў карапуза калісьці былі насавыя крывацёкі, праграванні супрацьпаказаныя. Пры некаторых захворваннях — паліпах, адэноідах і г. д. — яны могуць у большай ступені нашкодзіць, чым дапамагчы. А паколькі гэтыя праблемы ў малога могуць быць на момант прагравання не выяўленыя, без кансультацыі з доктарам нос лепш не праграваць. Калі ж доктар не выявіць у малога ніякіх прыкмет адэнаідыту або гнойнага гаймарыту, то можна выкарыстоўваць класічныя «бабуліны» цёплыя мяшочкі з соллю ці цёплае яйка.

● **Сагравальныя кампрэсы.** Іх, у адрозненне ад гарачкапаніжальных, без кансультацыі з педыятрам праводзіць нельга, таму што існуе шмат тонкасцяў і супрацьпаказанняў (напрыклад, пры атыце грэць вушка можна не заўсёды: пры серозным — рэкамендуюць, а пры гнойным — катэгарычна супрацьпаказана).

### Гарчыца — толькі не для алергікаў!

Сухую гарчыцу «ў народзе» прынята лічыць цуда-лекарам пры розных захворваннях. Большасць урачоў таксама згодныя, што гарчычнікі і нажныя гарчычныя (у тым ліку і «сухія») ванначкі — нядрэнныя адцягвальныя і адначасова сагравальныя працэдуры. За кошт паляпшэння кровазвароту скурных пакроваў яны стымулююць цеплааддачу і абмен рэчываў і садзейнічаюць вывядзенню прадуктаў інтаксікацыі. Але гарчыца — моцны алерген, таму яе ні ў якім выглядзе нельга выкарыстоўваць у хатняй фізіятэрапіі, калі ў дзіцяці ёсць не тое што дыягнаставаная алергія, але нават спадчынная схільнасць да яе. Дзецям да 3 гадоў «гарчычныя» працэдуры лепш не праводзіць.

● **Гарчычнікі.** Малым 3—6 гадоў іх лепш прыкладваць адваротным бокам (або нават пракладваць паміж скурай і гарчычнікам ваксаваную паперу). Гэтаксама, як і з банькамі, неабходна пазбягаць вобласці сэрца. Трымаць гарчычнікі доўга няма неабходнасці: для 3-гадовага малога дастаткова 3—4 хвіліны, для 4—6-гадовага — 8—10. Пасля працэдуры абавязкова пратрыце спінку і грудзі, каб выдаліць рэшткі гарчыцы, а затым намажце пачырванелыя месцы дзіцячым крэмам або медыцынскім вазелінам.

● **«Сухія» нажныя ваннечкі з гарчыцай.** Насыпце ў шкарпэткі па 1/4 ч. лыжкі гарчыцы і надзеньце іх малому. Калі дзіця паставіцца да гэтай працэдуры нармальна (не будзе хвалявацца, сцягваць шкарпэткі), пакіньце іх на ноч. У процілеглым выпадку — лепш здыміце, памыйце ножкі цёплай вадой і вытрыце насуха.

● **Нажныя ваннечкі з гарчыцай.** Падыходзяць толькі для тых дзяцей, якія ў стане пасядзець спакойна мінімум 10 хвілін. Вада для нажной ваннечкі не павінна быць занадта гарачай (34—36°С). Гарчычны парашок дадаюць з разліку 1 ст. лыжка на 1 літр вады. Пасля працэдуры ножкі таксама трэба абмыць вадой, выцерці насуха і надзець цёплыя шкарпэткі. Калі дзіця не захоча накрывацца коўдрай, не варта настойваць — эфект ад прагравання ад гэтага не стане меншым.

● Агульныя гарчычныя ванны нельга рабіць дзецям дашкольнага ўзросту.

**Увага!** *Для любой з апісаных сагравальных працэдур галоўнае супрацьпаказанне — павышаная тэмпература (больш як 37,5°С).*

### Банькі бываюць рознымі

Банькі прызначаюць, як правіла, пры бронха-лёгачных захворваннях, каб палепшыць дрэнажную функцыю лёгкіх. Праўда, выкарыстанне традыцыйных шкляных банек — вельмі рызыкоўная працэдура. Па-першае, для праграванння такой банькі даводзіцца маніпуляваць адкрытым агнём і спіртам, што вельмі небяспечна. Па-другое, ёсць верагоднасць перагрэць краі банькі і атрымаць апёк. Акрамя таго, трэба ўмець паставіць баньку правільна — так, каб на целе малога не засталося ліловых плям (гэта гематомы). Больш бяспечныя ў выкарыстанні вакуумныя банькі. З іх дапамогай робяць масаж. Змазваеце скуру крэмам або масажным алеем, бераце дзве пластыкавыя вакуумныя банькі, з дапамогай нагнятальніка захопліваеце скурную складку і пачынаеце вадзіць імі па спінцы (выключаючы пазваночнік): уверх—уніз і па крузе. Затым аналагічным чынам масажуеце грудзі дзіцяці, вядома, пазбягаючы вобласць сэрца. Такі масаж праводзяць на працягу 5—10 хвілін. Ён узмоцніць кровазварот у лёгкіх, і макрота будзе аддзяляцца лепш.

### Лечым горлачка

Фурацылін, ёд, сода — добрыя кампаненты для прыгатавання паласканняў для горла. Захоўваць асцярожнасць трэба хіба што пры выкарыстанні ёду: ён можа выклікаць алергічную рэакцыю. Таму перад ужываннем лепш правесці скурную спробу (памазаць ёдам скуру і паназіраць некаторы час за рэакцыяй). Не варта ўжываць для паласканняў эфірныя алеі — вельмі ўжо высокая рызыка алергіі. Больш бяспечныя для дзяцей настоі траў (не блытайце са спіртавымі настойкамі — іх выкарыстоўваць катэгарычна забаронена), асабліва рамонку, календулы, ваўчкоў і эўкаліпту. Толькі не захоўвайце іх у халадзільніку. У ідэале — перад кожнай працэдурай гатуйце новы раствор.

Якую б з фізіяпрацэдур вы ні праводзілі, памятайце пра галоўнае: неабходна растлумачыць дзіцяці, што і навошта вы робіце, а далей — сачыць за яго рэакцыяй. Калі малы адчувае дыскамфорт і супраціўляецца, працэдуру неабходна або адмяніць, або паспрабаваць ператварыць у гульню. Таму што эфект ад любога лячэння шмат у чым залежыць ад пазітыўнага настрою маленькага хворага.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

**Прыватнае ўнітарнае прамысловае прадпрыемства «Праметэй» (горад Горкі)**

# ЁСЦЬ ПРАЦА — ЁСЦЬ І СВЯТА





**Напярэдадні 23 лютага ў Магілёўскай вобласці былі названы лепшыя людзі мінулага года, усяго 15 чалавек. Чалавекам года ў сферы будаўніцтва аб'яўлены прадпрымальнік, генеральны дырэктар прыватнага ўнітарнага прамысловага прадпрыемства «Праметэй», размешчанага ў горадзе Горкі, Анатоль Федаровіч. Тут жа ўдакладнім: Анатоль Федаровіч з'яўляецца лаўрэатам спецыяльнай прэміі Горацкага райвыканкама «Чалавек года-2007», у 2008-м называўся лепшым прадпрымальнікам Магілёўскай вобласці за арганізацыю новых працоўных месцаў, лепшым прадпрымальнікам вобласці лічыўся ў 2009 годзе, а створанае ім прадпрыемства «Праметэй» у тым жа 2009 годзе было прызнана лепшай будаўнічай арганізацыяй раёна.**

## «Праметэй» як правобраз будучых грамадска-эканамічных адносін

Што ўяўляе сабой гэтая арганізацыя і чым у ёй займаюцца? Адразу ж падкрэслім: да гэтага не даводзілася сустракаць такога маштабнага менавіта прыватнага прадпрыемства — як па аб'ёмах работ, якія выконваюцца, так і па шматграннасці яго дзейнасці. Увогуле, асноўны профіль дзейнасці «Праметэя» — будаўніцтва, і яго ў гэтым плане, па магутнасці, можна смела параўнаць з 5—6 звычайнымі ПМК (перасоўнымі механізаванымі калонамі), калі скласці іх разам.

Неардынарнай асобай аказаўся і сам Анатоль Федаровіч. На наша віншаванне з «мужчынскім» святам ён коратка адказаў: «Ёсць праца — ёсць і свята». Аднак сустрэць працаголіка — не такая ўжо і рэдкасць. А вось як вам тое, што два гады таму па ініцыятыве Анатоля Іванавіча на яго прадпрыемстве была створана прафсаюзная арганізацыя, прычым з такой вось цікавай высновай, якую агучыў старшыня прафсаюзнага камітэта Мікалай Камоўскі: маўляў, у кіраўніка хапае спраў вытворчага ды фінансавага кшталту, а каму тым часам займацца непасрэдна чалавекам працы, яго сацыяльным абуладкаваннем? Вось няхай прафсаюзная арганізацыя і займаецца. А як вам тое, што на «Праметэі» дзейнічаюць такія некалькі нечаканыя для нашага часу, а тым больш — для прадпрымальніцтва, грамадскія арганізацыі як таварыскі суд ды камісія па барацьбе з п'янствам?

Дарэчы, што можна лічыць найлепшым падарункам для мужчыны на яго «мужчынскае» свята? На «Праметэі» ў дзень 23 лютага мужчыны атрымалі па вялізным торце і, між іншым, уручаў іх намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце (ёсць такая пасада і на «Праметэі», хоць, можа, і вельмі ўжо нечаканая для прыватнага прадпрыемства) Уладзімір Муралёў.

— Але ж далёка не ўсе мужчыны ахвочыя да салодкага... — заўважылі мы.

— Значыць, прынясуць дадому, наладзяць свята ў сям'і, — адказалі нам.

Анатоля Іванавіча Федаровіча на прадпрыемстве называюць «наш шэф», і ў гэтых словах гучыць вельмі шчырая павага да яго.

Але назавём яшчэ асобныя цікавыя адметнасці прыватнага прадпрыемства «Праметэй», дакладней — адметнасці сацыяльнага ўладкавання на ім (так бы мовіць, на добрую зайздрасць іншым). Адзначым: заработная плата тут знаходзіцца недзе на тым жа ўзроўні, што і ў іншых будаўнічых арганізацыях ці, можа, крыху вышэйшая за сярэдні ўзровень. Затое працаўнікі «Праметэя» маюць па 100 тысяч рублёў дадаткова да Дня будаўніка, 23 лютага, 8 Сакавіка, да Новага года; яны таксама атрымліваюць значную матэрыяльную дапамогу да водпуску, бясплатныя пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку; могуць паабедаць (у кавярні прадпрыемства ж) толькі за 50 працэнтаў кошту — астатняе, зразумела, бярэ на сябе менавіта прадпрыемства... Летась на «Праметэі» быў створаны ўласны ЖБК для будаўніцтва яго працаўнікамі жылля, з 40 чалавек, — удзельнікі гэтага будаўніцтва атрымалі ад «Праметэя» дапамогу на агульную суму каля 200 мільёнаў рублёў... Многія ў краіне, калі гавораць пра прадпрымальніцтва і прадпрымальнікаў, нярэдка выказваюцца ў яўна адмоўным плане. Аднак не ўсё так дрэнна з нашым новым класам, які, па сутнасці, толькі нараджаецца: каб пераканацца ў гэтым, варта пазнаёміцца з дзейнасцю прыватнага прадпрыемства «Праметэй» і яго стваральнікам і кіраўніком.

**Анатоль Іванавіч Федаровіч не з'яўляецца будаўніком па адукацыі. Разам з тым з поўным на тое правам залічвае сябе да прадстаўнікоў гэтай паважанай прафесіі. Папершае, нарадзіўся ў сям'і будаўніка. А па-другое, чатыры гады запар, калі яшчэ вучыўся ў ВНУ, на чале студэнцкага будаўнічага атрада ўдзельнічаў у новабудоўлях народнай гаспадаркі некалі вялікай савецкай краіны. Пры гэтым, па выніках ранейшага будатрадаўскага спаборніцтва, яго атрад у 1986 годзе заняў першае месца ў рэспубліцы і другое месца ў Саюзе. І ў тым жа 1986 годзе камандзір студэнцкага будаўнічага атрада Анатоль Федаровіч быў узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць». Як прыгадвае цяпер Анатоль Іванавіч, па 12 гадзін у дзень шчыравалі будатрадаўцы на даручаных ім аб'ектах, выхадны дзень рабілі адзін раз за паўмесяца. Праўда, і грошы мелі неблагія. Аднак грошы грашыма, а разам з тым выхоўвалі ў сябе маладыя будатрадаўцы характар, такі неабходны для далейшага, дарослага, жыцця, ды ўменне пераадольваць цяжкасці. Дарэчы, называўся той атрад «Праметэем». Вельмі ёмкі працяг атрымала гэтая назва сёння...**

**Анатоль Федаровіч мае дзве вышэйшыя адукацыі. Першая з іх — вучоны аграном (пасля заканчэння Горацкай сельгасакадэміі), другая — правазнаўства. Адзінаццаць гадоў адпрацаваў у Чавускім раёне, з іх чатыры гады — кіраўніком гаспадаркі. Ды будаўнічая жылка ўсё ж узяла сваё.**





* * *

Як адзначана ўжо, асноўная прафесія «Праметэя» — будаўніцтва, прычым выконваюць праметэеўцы ўсе віды будаўніча-мантажных работ. Увогуле, на прадпрыемстве ўладарыць свайго роду дэвіз «Ад нуля — пад ключ». Гэта значыць, што выключна ўсе работы на аб'ектах праметэеўцы выконваюць менавіта самі, выключна сваімі сіламі, без прыцягнення пабочных арганізацый, субпадрадчыкаў. Выконваюць у тым ліку складаныя сантэхнічныя работы, электратэхнічныя і іншыя, маюць спецыяльныя ліцэнзіі на правядзенне гэтых работ і спецыяльна падрыхтаваных людзей: напрыклад на абуладкаванне электразабеспячэння да 10 тысяч кілавольт. Летась прадпрыемства «Праметэй» выканала будаўніча-мантажных работ на суму каля 50 мільярдаў рублёў, прычым апошнім часам штогод нарошчвала аб'ёмы на 20 і болей працэнтаў. А сёлета з улікам таго партфеля заказаў, які маецца, тут мяркуюць выйсці на 100 з лішкам мільярдаў, або прырасці больш чым удвая. «Усё будзе залежаць ад фінансавання намечаных аб'ектаў», — падкрэсліваюць на прадпрыемстве.

Якія аб'екты і дзе ўзводзіць «Праметэй»? Сфера яго дзейнасці распаўсюджваецца практычна на ўсю Магілёўскую вобласць. А ўзводзяць праметэеўцы як жыллё (у тым ліку шматкватэрныя дамы і дамы катэджнага тыпу ў вёсцы), так і аб'екты сельскагаспадарчага, а таксама сацыяльна-бытавога прызначэння. У прыватнасці, летась працаўнікі прадпрыемства пабудавалі адзін 80-кватэрны жылы дом у Чавусах і два дамы ў Горках; на іх леташнім рахунку таксама сучасны малочнатаварны комплекс у гаспадарцы «Горы» Горацкага раёна, капітальна адрамантаваны клуб і інтэрнат у сельскагаспадарчай акадэміі і іншыя аб'екты. Сёлета прадпрыемства здае 40-кватэрны дом у Горках для сваіх працаўнікоў, 12 дамоў катэджнага тыпу ў аграгарадку «Леніна» і 10 у вёсцы Паршына (сядзіба вучэбнай гаспадаркі сельгасакадэміі). Гэтыя аб'екты практычна закончаныя; разам з тым ідуць работы па ўзвядзенні 9-павярховага 72-кватэрнага дома ў Горках (мы пабывалі на яго будаўніцтве: гэта двухсекцыйны дом з цікавымі архітэктурнымі формамі, арыгінальнымі лоджыямі, і, безумоўна, ён упрыгожыць горад); узводзяцца два 60-кватэрныя дамы ў Чавусах. Вельмі важны аб'ект сёлетняга года, якому надаецца асаблівая ўвага непасрэдна з боку самога кіраўніка «Праметэя», — буйны малочнатаварны комплекс на 1100 галоў у вучэбнай гаспадарцы сельгасакадэміі. Гэты комплекс павінен стаць паказальным у краіне, прычым ён будзе выкарыстоўвацца і для вучэбных мэтаў пры падрыхтоўцы спецыялістаў акадэміі; тут будзе ўстаноўлена навейшае абсталяванне па ўтрыманні і даенні жывёлы. Зразумела, гэта асабліва знакавы аб'ект, зразумела таксама і тое, што і «Праметэй» у якасці выканаўцы ўсіх работ на ім выбраны невыпадкова.

Кіраўнік «Праметэя» назваў і іншыя найбольш маштабныя аб'екты, якія пры гэтым па кошце запланаваных на іх работ маюць каштарыс на паўмільярда рублёў і болей (дарэчы, фінансаванне толькі будаўніча-мантажных работ на комплексе ў Паршына вызначана ў суме больш за 30 мільярдаў рублёў). У спіс аб'ектаў сёлетняга года ўваходзяць яшчэ дзве таксама сучасныя МТФ у іншых гаспадарках раёна, а таксама буйная МТФ у Шклоўскім раёне, добраўпарадкаванне базы дарожнікаў, размешчанай побач, цераз дарогу, рэканструкцыя завода жалезабетонных вырабаў у Чавусах, будаўніцтва Дома паляўнічага ў Магілёўскім лясгасе, капітальны рамонт будынка Горацкага райвыканкама, пракладванне новых сетак каналізацыі ў Горках, будаўніцтва зернеачышчальна-сушыльнага комплексу ў вучэбнай гаспадарцы сельгасакадэміі, рэканструкцыя аднаго з карпусоў Горацкага машынабудаўнічага завода і іншыя аб'екты. «Планы вялікія, — падкрэсліваў Анатоль Федаровіч, — і асаблівае значэнне набываюць усе гэтыя планы ў сувязі з рэспубліканскімі Дажынкамі, якія маюць быць у Горках у наступным годзе».

Але, як таксама падкрэсліваў ён, ёсць добрая аснова для выканання гэтых планаў, ёсць добрая матэрыяльна-тэхнічная база. Сёння прадпрыемства налічвае больш за 100 адзінак тэхнікі, прычым толькі за апошні год на ім набылі тэхнікі (па розных артыкулах — у лізінг, за доўгатэрміновыя крэдытныя рэсурсы і г.д.) на суму каля 7 мільярдаў рублёў: два экскаватары, два бульдозеры, чатыры франтальныя пагрузчыкі французскай вытворчасці («і пяты на падыходзе»), два міксеры, два 20-тонныя КамАЗы і іншую тэхніку. Толькі на лізінгавыя плацяжы прадпрыемства штомесяц выдаткоўвае па 300 мільёнаў рублёў.

Добра дапамагае калектыву «Праметэя» ў працы, а найперш у зніжэнні кошту будаўніча-мантажных работ таксама тое, што яно самастойна вырабляе многія будаўнічыя матэрыялы на сваёй выдатнай вытворчай базе. Так, тут маюць свой участак вытворча-тэхнічнай камплектацыі, дрэваапрацоўчы цэх са сталярняй, цэх металавырабаў, цэх па вырабе вокнаў ПВХ, растворабетонны вузел. Прычым гэтая база апошнім часам інтэнсіўна развіваецца далей. Так, у цэху, дзе вырабляюцца вокны ПВХ, вось-вось павінна ўступіць у дзеянне аўтаматызаваная лінія па вырабе шклопакетаў. А побач, у іншым новым цэху, хутка павінны быць устаноўлены лініі па вытворчасці ўцяпляльных сэндвіч-панэляў і па вырабе полістыролу. Ужо падкрэслівалася асаблівая ўвага на прадпрыемстве да такога вельмі важнага для яго аб'екта, як малочнатаварны комплекс у вучэбнай гаспадарцы сельгасакадэміі, — камплектаваць яго прадпрыемства будзе менавіта ўласнымі сэндвіч-панэлямі. Упершыню.



А яшчэ на прадпрыемстве маюць свой пясчаны кар'ер (параўнальна нядаўні набытак), свае пад'язныя чыгуначныя пуці (да 2—2,5 тысячы тон будаўнічых матэрыялаў, або 50 працэнтаў іх, «Праметэй» атрымлівае чыгункай); тут рыхтуюць да мантажу вялізны арачнік плошчай каля тысячы квадратных метраў, у якім будуць захоўвацца будаўнічыя матэрыялы.

Карацей кажучы, на сённяшні дзень прадпрыемства «Праметэй» уяўляе сабой маштабны прамыслова-будаўнічы комплекс, з якім у краіне могуць пасупернічаць толькі асобныя будаўнічыя арганізацыі. І гэтаму комплексу, безумоўна, пад сілу любыя задачы. Застаецца дадаць, што на «Праметэі» нядаўна паспяхова вытрымалі экзамен па сертыфікацыі менеджменту сістэмы якасці яго будаўнічай прадукцыі.

* * *

Аднак вось пытанне, якое напрошваецца: тая ж выдатная матэрыяльная база, тая ж бліскучая тэхнічная аснашчанасць — гэта яшчэ далёка не ўсё, яны мёртвыя без чалавечых рук. А як з кадрамі на «Праметэі», з людскімі рэсурсамі? Горкі — гэта ўсё ж такі не Мінск, дзе кваліфікаваныя кадры знайсці лягчэй...



— Каб не страчваць свой патэнцыял, рэгулярна абучаем кадры, адпраўляем іх на курсы павышэння кваліфікацыі, — адзначае першы намеснік генеральнага дырэктара Юрый Арэшка. — Не сакрэт — прыватніку выжываць цяжэй, чым дзяржаўным прадпрыемствам, і мы павінны мець намнога вышэйшы рэсурс, каб з імі паспяхова супернічаць. У тым ліку і чалавечы, кваліфікацыйны рэсурс...

А ўвогуле, на «Праметэі», па сутнасці, і не ведаюць, што такое кадравы голад. Больш за тое, каб уладкавацца на прадпрыемства — чарга; адбор кадраў — на конкурснай аснове. Прычым «Праметэй» пастаянна папаўняецца новымі працоўнымі рэсурсамі: толькі за апошні год на ім працаўладкавана каля 150 чалавек. Далейшае павелічэнне штату чакаецца і сёлета, пасля ўвядзення новых вытворчасцяў. Усяго ж цяпер працуе на «Праметэі» больш за 800 чалавек.

* * *

— А вы не каштавалі беларускія «Есентукі»? — запыталіся ў нас падчас візіту ў Горкі, на прадпрыемства «Праметэй».

Мы — не. Праўда, нам тут жа паабяцалі, што неўзабаве пакаштуем...

У адным з новых цэхаў «Праметэя» нам паказалі ўсталяваную тут аўтаматычную лінію па разліве мінеральнай вады (на лініі ішлі апошнія пусканаладачныя работы). Свідравіна — побач, у невялікай будачцы за 20 метраў — помпа, глыбіня свідравіны — 544 метры.

Гэтую свідравіну генеральны дырэктар «Праметэя» выкупіў у сумеснага беларуска-расійскага прадпрыемства, якое суседнічала з ім, яшчэ вясной 2009 года. Пачалі пампаваць тую ж ваду, ды ўжо адразу вырашылі: можна пампаваць значна болей. Вада добрая, з невялікай ступенню мінералізацыі (1,79 міліграма мікраэлементаў на літр), а гэта значыць — можна не разбаўляць яе артэзіянскай вадой, як робяць гэта іншыя... Адным словам, сапраўдная натуральная мінеральная вада, прыродная. Да таго ж атрымалі на яе сертыфікат Еўрасаюза. У выніку і з'явілася рашэнне паставіць новую, больш сучасную аўтаматычную лінію па разліве гэтай вады, прадукцыйнасць якой разлічана на 3 тысячы ПЭТ-бутэлек у гадзіну.

Мінеральная вада, якая носіць назву «Горацкая», будзе разлівацца ў паўтаралітровыя, літровыя і паўлітровыя ПЭТ-бутэлькі. Яе намечана рэалізоўваць пераважна ў Магілёўскай, Віцебскай і Гомельскай абласцях, а таксама часткова і ў іншых. Намацваюцца шляхі і для яе экспарту. Гэты праект асабліва рэальна выглядае ў сувязі з планамі прадпрыемства мадэрнізаваць старую лінію і наладзіць там выпуск сваёй мінеральнай вады ў шкляной бутэльцы, якая зноў аказалася запатрабаванай у свеце.

На прадпрыемстве таксама плануецца наладзіць выпуск мінеральнай негазіраванай вады з дабаўленнем ёду і селену, а таксама з янтарнай кіслатой (гэтыя дабаўкі павінны надаць горацкай мінеральнай вадзе больш выразныя лекавыя ўласцівасці).






А яшчэ на новай лініі прадпрыемства намечана наладзіць да надыходу летняга сезона вытворчасць асвяжальных безалкагольных напояў на аснове цукру і натуральных сокаў. Вельмі неблагое дапаўненне выбралі на «Праметэі» да сваёй асноўнай вытворчай дзейнасці.

* * *

І яшчэ пра адзін «вытворчы ўчастак» «Праметэя», расказ пра які мы невыпадкова пакінулі на заканчэнне, так бы мовіць, на «закусь». Ну вельмі ж цікавы «ўчастак». А размешчаны ён побач са знакамітым пасёлкам Леніна, пад якім некалі атрымала баявое хрышчэнне польскае войска, сфарміраванае ў Саюзе падчас вайны. Дык вось, тут, побач з пасёлкам, узвялі праметэеўцы выдатную базу для адпачынку, на якой ёсць для гэтай мэты, па сутнасці, усё: і выдатныя драўляныя домікі, у кожным з якіх можа размясціцца да 10 чалавек, і месцы, абсталяваныя «пад шашлык» ды «пад юшку». А тым больш побач — возера на 68 гектараў, узятае ў арэнду. З рыбай (у яго запусцілі некалькі тон і карпа, і таўсталобіка, і белага амура). Тут жа — і абсталяваны прычал, лодкі, катамараны. На гэтай базе адпачынку, якая носіць назву «Мерэя», дабудоўваецца 2-павярховая гасцініца. Да 60 чалавек адначасова могуць адпачываць у гэтым месцы. Прычым не толькі свае, не толькі з «Праметэя». Такім чынам, запрашае база адпачынку «Мерэя»!

Якраз тут дарэчы будзе нагадаць і пра тое, што на «Праметэі» не меншую ўвагу, чым свайму тэхнічнаму аснашчэнню, удзяляюць стварэнню для сваіх работнікаў самых спрыяльных бытавых умоў. На тэрыторыі прадпрыемства прыцягвае ўвагу двухпавярховы дамок, які яўна не трапляе пад катэгорыю аб'ектаў вытворчага прызначэння. «А гэта наш дом вадзіцеля, — растлумачылі нам. — У ім абсталяваны добрыя пакоі адпачынку, гардэробныя, ёсць саўна»... Падобныя аб'екты будуць узведзены на прадпрыемстве яшчэ. Дарэчы, не забыліся тут і пра тых, хто знаходзіцца, так бы мовіць, у палявых умовах. На прадпрыемстве маюць для іх каля 50 зручных бытовак.

— А паглядзелі б вы наша прадпрыемства летам, — казалі нам. — Уся тэрыторыя базы — пад цвёрдым пакрыццём, кругом — газоны, клумбы, ёсць невялічкае азярцо. Здавалася б, дробязі, а людзям прыемна. Летась мы занялі ў раёне другое месца па добраўпарадкаванні...

Што застаецца дадаць на заканчэнне? Няхай працаўнікам «Праметэя» будзе гэтак жа прыемна і камфортна працаваць і адпачываць і надалей. Ну, а кіраўніку «Праметэя» Анатолю Іванавічу Федаровічу — новых добрых ідэй і задумак у яго справе. І гэткага ж выдатнага сацыяльнага партнёрства з калектывам.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

УНП 700423316.

**НА ЗДЫМКАХ:**

**1. Генеральны дырэктар Анатоль ФЕДАРОВІЧ — чалавек года-2010 у Магілёўскай вобласці.**

**2. Намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу Андрэй КАЧУРКА задаволены: кола партнёраў «Праметэя» становіцца больш шырокім.**

**3. Гэты прыгожы дом пабудавалі ў «Праметэі» для сваіх супрацоўнікаў.**

**4. Буйная малочнатаварная ферма, якую ўзводзяць будаўнікі «Праметэя» ў вёсцы Паршына, непадалёк ад Горак, павінна стаць узорнай у рэспубліцы.**

**5. Новыя ўтульныя дамы ад «Праметэя» ў Задарожжы.**

**6. Прараб Уладзімір ПІСАРАЎ (у цэнтры) і брыгада муляраў: Аляксей ЮДЗІН, Антон БУЙДЗЯНКОЎ, Міхаіл ГУНКЕВІЧ, Павел УЛІТНІКАЎ, Сцяпан АСЮЦІН, Анатоль МІГДАСЁЎ і Мікалай КАЛАКОЛЬЦАЎ.**

**7. Падчас наведвання прадпрыемства тут праводзіліся апошнія наладачныя работы на новай сучаснай лініі па разліве мінеральнай вады. На здымку наладчык лініі Генадзь РАЛЕВІЧ.**

**8. Прадпрыемства пашырае сваю дзейнасць: на ім таксама з'явілася новая лінія па вытворчасці шклопакетаў. На здымку зборшчык шклопакетаў Аляксандр КАБЫШАЎ.**

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**








# «КАЛІ МЫ З КІМСЬЦІ НЕ «ПАЖЭНІМСЯ», ТО НЕ ВЫЖЫВЕМ»

**Генеральны дырэктар Мінскага аўтамабільнага завода Аляксандр БАРОЎСКІ падзяліўся з журналістамі сваімі меркаваннямі наконт магчымага аб'яднання МАЗа і КамАЗа ў холдынг:**

— На імя Прэзідэнта Беларусі паступіла прапанова ад «Групы ГАЗ» аб давераным кіраванні МАЗам на два гады. У гэты ж час паступіла прапанова ад КАМАЗа, а калі дакладней, то ад «Растэхналогій» — яны прапанавалі зрабіць нам холдынг. Сяргей Чэмезаў (генеральны дырэктар дзяржкарпарацыі «Растэхналогіі». — **Аўт**.) нас запрасіў, і я, а таксама наш першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка правялі працоўную сустрэчу. Было прапанавана, што яны ў гэты холдынг аддаюць 42% КамАЗа, а мы — 42% МАЗа (далей Аляксандр Бароўскі паправіўся і казаў ужо пра 48%. — **Аўт**.). Плюс у гэты холдынг мы аддаём частку сваіх заводаў, а яны — сваіх. Зараз прынята рашэнне стварыць працоўную групу, якая абмяркуе мэтазгоднасць стварэння гэтага холдынгу, — паведаміў гендырэктар МАЗа і выказаў сваё меркаванне на гэты конт: — У прынцыпе, мая пазіцыя такая: МАЗ сёння адзін выжыць не зможа.

Такую сваю пазіцыю Аляксандр Бароўскі тлумачыць тым, што хутка Расія ўступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю, а значыць, мытныя пошліны на грузавыя машыны будуць зніжаныя, і расійскія і беларускія вытворцы аўтатэхнікі могуць не вытрымаць канкурэнцыю з замежнымі фірмамі. Таксама ён бачыць вялікую пагрозу ад кітайскіх вытворцаў грузавых аўтамабіляў, якія таксама не спяць у шапку і з цікавасцю глядзяць на рынкі СНД.

— Нам усё роўна трэба з кімсьці аб'ядноўвацца, аднаму МАЗу будзе вельмі цяжка ў такой канкурэнцыі выжыць. Чаму менавіта КамАЗ? Яны маюць рухавікі «Камінз», з якімі мы сёння таксама вядзём распрацоўкі, яны маюць сваю каробку перадач, іх цікавіць наш мост... Калі на высокім узроўні будзе прынята рашэнне стварыць холдынг, то гэта нам дасць і агульныя рынкі... Так што казаць, што МАЗ некаму там прадаецца — няправільна. Ідзе праца, мы раімся і глядзім, дзе нам лепш, — сказаў Аляксандр Бароўскі.

Пры гэтым ён дадаў, што, па сутнасці, акрамя КамАЗа, Мінскаму аўтамабільнаму заводу больш і няма з кім аб'ядноўвацца:

— Я з'ездзіў на МАН, прапанаваў ім: давайце супрацоўнічаць. Адказу мы не атрымалі. Я з'ездзіў на «Івека», мяне прынялі добра, дэлегацыя ў адказ прыехала, і вы думаеце ёсць адказ? Няма. «Мерседэсу» мы не патрэбны, бо ён купіў КамАЗ, «Вольва» мае сваё прадстаўніцтва ў Расіі. І болей «жаніцца» няма з кім, а «жаніцца» трэба, бо мы адны не выжывем — нас задавяць тэхналогіямі, аб'ёмамі і гэтак далей. Таму прапановы «Групы ГАЗ» і «Растэхналогій» будзем разглядаць, але для гэтага патрэбна працоўная група і ацэнка прадпрыемстваў. І што нам замінае: аддадзім акцыі ў холдынг, папрацуем год, не атрымаецца — мы ж нічога не губляем, разыдземся, забяром акцыі і пойдзем далей з іншым вяселле спраўляць. Ну і нарэшце: гэта ж Расія — нам што, сказаць ім «не»? Мы ж павінны быць дыпламатамі і псіхолагамі, мы павінны пачаць перамовы і паглядзець, дзе нам выгадна.

Таксама Аляксандр Бароўскі паведаміў, што праца па набыцці часткі акцый МАЗа Венесуэлай вядзецца і што ён чакае грошай ад гэтай здзелкі, каб пачаць рэканструкцыю:

— Умоўна кажучы, калі Венесуэла ў нас купіць 10%, то гэта 200-300 мільёнаў долараў, іх Прэзідэнт паабяцаў аддаць нам на развіццё. І я чакаю, калі гэта адбудзецца, з'явяцца грошы і я пачну глабальную рэканструкцыю на МАЗе.

Але Аляксандр Бароўскі падкрэсліў, што ён толькі выказвае сваё меркаванне, а канчатковае рашэнне наконт лёсу МАЗа павінен прымаць урад, бо 100% акцый знаходзіцца ў дзяржавы:

— У прынцыпе, гэта не мае пытанне, бо 100% акцый у дзяржавы. Мая справа — каб МАЗ квітнеў: машыны выпускаць, зарплаты падымаць, якасць рабіць. А каму аддаваць — права вырашаць гэта ў дзяржавы. У мяне нават паловы акцыі няма. Вось мы сядзім з Сяргеем Кагогіным (генеральны дырэктар КамАЗА. — **Аўт**.), у нас з ім нармальныя стасункі, і ён кажа: «Ведаеш, у чым розніца паміж намі? Ты генеральны і я генеральны, але я ўладальнік акцый і таму ў



мяне самалёт, а ты на веласіпедзе катаешся. Вось у тым розніца».

Больш падрабязна і практычна на пальцах пра магчымыя выгады ад аб'яднання МАЗа і КамАЗа ў холдынг журналістам патлумачыў **Віктар КАЛЕЧЫЦ, першы намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах:**

— Увесь свет, прынамсі, вытворцы грузавой і легкавой аўтатэхнікі аб'ядноўваюцца. Гэта робіцца не проста так — з гэтага можна атрымаць пэўны эфект. І, вывучаючы вопыт іншых кампаній, мы таксама можам атрымаць эфект ад разумнага аб'яднання. Які? Напрыклад, мы аб'ядналіся і стварылі холдынг — мы можам у рамках гэтага холдынгу прыцягнуць крэдыты і стварыць сумесны завод, скажам, па вытворчасці задніх мастоў. І іх будуць выкарыстоўваць усе прадпрыемствы холдынгу, а ў іншым выпадку кожнаму прыйшлося б будаваць свой такі завод. А калі глядзець далей, то гэта можа быць і палітыка продажаў і гэтак далей.

## Якасць амаль еўрапейская, цана — беларуская

На сёння апошняй важнай для МАЗа падзеяй з'яўляецца вытворчасць новых кабін з двухкампанентнай афарбоўкай, што павінна вырашыць праблемы з карозіяй:

— У нас ёсць дзве мадыфікацыі кабіны — серыйная з індэксам 6422 і новая з індэксам 6430. І менавіта ў студзені мы стварылі магутнасці і на сёння машын з новай кабінай выпускаем больш, чым з серыйнай, — расказвае **галоўны інжынер МАЗа Юрый ТАРУЦЬ.** — Два тыдні таму мы атрымалі цудоўнае лакафарбавае двухкампанентнае пакрыццё ад лідскай «Лакафарбы», якое абсалютна нас задавальняе, адпавядае ўсім нашым тэхнічным умовам і, што немалаважна, канкурэнтнае па цане з імпартнымі аналагамі. У двухкампанентнай фарбы зусім іншыя ўласцівасці — высокая трываласць і прывабны знешні выгляд, хоць падаражэнне для пакупніка ад прымянення двухкампанентнай фарбы будзе амаль незаўважнае, — мяркуе галоўны інжынер.

— Мы сёння паказалі вам новую вытворчасць кабін і, што самае важнае, новую афарбоўку. Было сорамна, калі ў нас былі ржавая кабіна і кузаў — як можна так на рынку працаваць? Мы паставілі перад сабой задачу да канца года гэтую праблему зняць, — кажа Аляксандр Бароўскі. — Можа, нельга хваліцца, але КамАЗ спрабуе новую кабіну паставіць даўно, яны заплацілі 20 мільёнаў долараў за распрацоўку, і яна ў іх не пайшла. А мы самі зрабілі кабіну, самі паставілі на паток, і яна ў нас сёння ідзе. Аднак мы на гэтым не спынемся: да канца года мы павінны атрымаць новы сучасны аўтамабіль — амаль еўрапейскай якасці, але па беларускай цане. Мы заказалі абсталяванне па падрыхтоўцы да афарбоўкі, зрабілі новую вытворчасць кузавоў, закупілі новую тэхналогію для афарбоўкі рам, для вытворчасці рысор, а ў першым квартале наступнага года хочам атрымаць новы мост для нашых аўтамабіляў.

Таксама на МАЗе задумалі памяняць і інтэр'ер кабіны, пра што даўно прасілі спажыўцы: будзе новая панэль прыбораў, абіўка і іншыя рэчы.

Як расказаў **галоўны канструктар МАЗа Аляксандр ЗАХАРЫК,** хутка на МАЗах з'явіцца новы рухавік «Камінз», які, па яго меркаванні, павінен стаць лепшым варыянтам па цане і якасці:

— Асноўны наш партнёр — Яраслаўскі маторны завод, шырокую гаму рухавікоў атрымліваем ад Мінскага маторнага завода, ёсць у нас рухавікі МАНа і «Мерседэса». А сёння ў нашай лінейцы з'яўляецца рухавік «Камінз», які, магчыма, будзе лепшым варыянтам па цане і якасці. «Камінз» — гэта амерыканскі рухавік, які сёння выпрабляецца ў шэрагу краін, у прыватнасці ў Расіі і ў Кітаі, — сказаў Аляксандр Захарык, але не ўдакладніў, якой вытворчасці рухавікі будуць прымяняцца на МАЗах.

Па яго словах, усе пагадненні падпісаныя, зараз будуць створаны і сертыфікаваны доследныя ўзоры, і толькі потым можна будзе казаць пра плюсы і мінусы, а таксама пра запуск МАЗаў з рухавікамі «Камінз» у серыю.

— Я мяркую, што «Камінз» гарманічна ўпішацца ў аб'ёмы вытворчасці і іншыя пастаўшчыкі не пацерпяць страт — мы проста зробім большымі аб'ёмы. Так было, калі мы ўкаранялі імпартныя рухавікі «Мерседэс» і МАН — мы не забралі аб'ём у ЯМЗ, а проста дадалі аб'ёмы МАЗа. З «Камінзам» зараз у нас вядуцца працы па ЕЎРА-3 і ЕЎРА-4. Што тычыцца ЕЎРА-5, то такія рухавікі ў «Камінза» таксама ёсць, але мы ж не можам адначасова зрабіць усю гаму — гэта будзе рабіцца паступова, — паведаміў Аляксандр Захарык.

## Краш-тэстаў мікрааўтобусаў не прадбачыцца, але бяспека — будзе абавязкова

За 2010 год на МАЗе было створана 16 новых мадэляў. Як паабяцаў генеральны дырэктар, навінкі будуць і сёлета. Прынамсі, у жніўні адбудзецца прэзентацыя капотнага 60-тоннага грузавіка, а таксама на працягу 2011 года павінна пачацца серыйная вытворчасць мікрааўтобусаў:

— Мікрааўтобусы — гэта новы клас у прадуктовай лінейцы МАЗа, — кажа **Аляксандр МЫШКО, галоўны канструктар філіяла МАЗа па вытворчасці аўтобусаў.** — Яны прадугледжаны для выкарыстання ў першую чаргу як службовыя, маюць 14 месцаў для пасажыраў, дызельны рухавік ЕЎРА-3 або ЕЎРА-4. Гэтая мадэль арыентавана перш за ўсё на Беларусь, але не выключаю, што потым будзе пастаўляцца і ў краіны СНД і далёкага замежжа.

Паколькі пасля прэзентацыі МАЗам гэтых мікрааўтобусаў у канцы мінулага года энтузіясты адшукалі ў інтэрнэце такія ж самыя мікрааўтобусы, але кітайскія, то карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся, чые распрацоўкі выкарыстоўвае МАЗ пры вытворчасці гэтых мікрааўтобусаў і наколькі яны будуць бяспечныя:

— Я не магу сказаць, кітайская гэта мадэль ці не кітайская. Магу толькі сказаць, што яна будзе лакалізавана ў нас у Беларусі. Што тычыцца бяспекі, то любая тэхніка, якая выпускаецца на МАЗе, адпавядае ўсім тым стандартам, якія дзейнічаюць на канкрэтным рынку збыту. У нашым выпадку гэтая тэхніка адпавядае стандартам Рэспублікі Беларусь, — сказаў Аляксандр Паўлавіч і дадаў, што краш-тэсты гэтага мікрааўтобуса праводзіцца не будуць, бо гэта не легкавы аўтамабіль і не аўтобус з колькасцю месцаў больш за 22. — Вядома, я сам сеў бы на такі мікрааўтобус, я ездзіў на ім і лічу, што можа гэта не «Мерседэс», але задача гэтага аўтобуса — не канкурыраваць з «Мерседэсам», а быць мінімальна дарагім і максімальна функцыянальным, адпавядаць тым запытам, якія існуюць на нашым рынку.



## МАЗ хоча выйсці на дакрызісны ўзровень

Генеральны дырэктар МАЗа Аляксандр Бароўскі расказаў пра вынікі 2010 года і падзяліўся планамі на 2011 год:

— Я вельмі задаволены, як мы закончылі мінулы год. Усе тыя паказчыкі, што намецілі, мы выканалі: тэмпы росту вытворчасці — 122,6%, экспарт — 263%; мы маем станоўчае сальда 75 мільёнаў долараў, маем добрую рэнтабельнасць 10%; практычна ў два разы вырасла зарплата — на сёння яна склала 2,022 мільёна. На гэты год мы ўзялі на сябе нагул фантастычныя абавязацельствы: забяспечыць тэмпы росту вытворчасці ў памеры 150%, за кошт унутраных мерапрыемстваў зэканоміць 610 мільярдаў рублёў, павялічыць сальда знешняга гандлю ў 2-3 разы, — сказаў Аляксандр Бароўскі і дадаў, што МАЗ сёлета будзе разлічвацца з дзяржавай па пазыках. — У свой час МАЗу была аказана дапамога ў памеры 570 мільярдаў рублёў. У гэтым годзе прыйшоў час аддаваць. Мы палічылі і прыйшлі да высновы, што сёлета мы поўнасцю разлічымся з дзяржавай: у 2011 годзе нам трэба вярнуць 440 мільярдаў рублёў, і мы гэтыя грошы вернем, бо добра разумеем усю сітуацыю ў краіне, ведаем пра стан бюджэту. Задача складная: нам трэба аддаваць кожны месяц па 35 мільярдаў, але мы гэта зробім, — перакананы генеральны дырэктар.

Дарэчы, агучаныя 150% росту вытворчасці ў 2011 фактычна вернуць МАЗу дакрызісны аб'ём, пра што заявіў Віктар Калечыц, першы намеснік гендырэктара па эканоміцы і фінансах:

— 150% — гэта фактычна дакрызісны ўзровень вытворчасці на МАЗе. Мы будзем вымушаны рабіць такую колькасць аўтамабіляў, каб мінімізаваць пастаянныя выдаткі і мець нармальную рэнтабельнасць. Я думаю, у нас усё атрымаецца, хоць задача вельмі і вельмі сур'ёзная і запатрабуе вялікіх намаганняў ад усяго калектыву.

Што тычыцца продажаў у 2010 годзе, то яны склалі 150% ад узроўню 2009 года (22980 аўтамабіляў). Розніцу паміж продажамі і вытворчасцю (апошняя склала 122,6%) **Аляксей ТУТУБАЛІН, намеснік па камерцыйных пытаннях,** тлумачыць тым, што распрадаваліся складскія запасы. Змянілася за 2010 год і структура продажаў: калі ў 2009 годзе 69,5% тэхнікі прадавалася ў Беларусі, 16% у Расіі, то ў мінулым годзе ў РФ пастаўлялася 38,6% прадукцыі, а ў Беларусь — 41,25%.

Аляксей Тутубалін расказаў і пра планы продажаў МАЗа на 2011 год: прынамсі, у Расію продажы павінны скласці 158,3%, ва Украіну — 250,1%, у краіны СНД і Цэнтральнай Азіі — 114,4%, у краіны далёкага замежжа -185,1%. Адзінае, куды будзе пастаўляцца менш тэхнікі, — гэта Беларусь, толькі 72,6% ад аб'ёму 2010 года. Але, па словах намесніка гендырэктара па камерцыйных пытаннях, гэта зроблена свядома:

— Што тычыцца Беларусі, то мы планамерна скарачаем запланаваныя аб'ёмы рэалізацыі ў краіну, мы павінны ў гэтым годзе зрабіць 72% да ўзроўню 2010 года, калі нас не паправіць Радзіма. А калі нам Радзіма загадае прадаць у Беларусь больш, — значыць, мы гэта зробім з задавальненнем.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## ВАДА ІДЗЕ

**У Брэсцкай вобласці, асабліва ў Брэсцкім раёне, зноў адзначаецца высокі ўзровень грунтовых вод. Талымі водамі падтоплены дзясяткі падворкаў, больш за 60 садовых участкаў, многія гектары сельгасугоддзяў.**

Паводле слоў кіраўніка прэс-службы абласнога ўпраўлення МНС Сяргея МАШНОВА, дзякуючы павольнаму пацяпленню сітуацыя пакуль не такая напружаная, як прагназавалі раней. Паступова разліваюцца рэкі — Заходні Буг, Прыпяць, Піна, Ясельда. У Пінскім раёне зафіксаваны падтапленні на 59 падворках. Але рэкі паводзяць сябе адносна спакойна. Так, 10 сакавіка ўзровень вады ў рэках быў крыху ніжэйшы, чым адзначаўся днём раней. Далейшае будзе залежаць ад інтэнсіўнасці пацяплення.

**Яна СВЕТАВА.**



### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «Світанак» г. Жодино за 2010 год (млн руб)

| ПОКАЗАТЕЛЬ | |
|---|---|
| 1. Выручка от реализации (за минусом НДС и др. аналогичных обязательных платежей) | 205094 |
| 2. Себестоимость реализованных товаров, работ, услуг | 177983 |
| 3. Прибыль от реализации | 27111 |
| 4. Сальдо операционных доходов и расходов | -52 |
| 5. Сальдо внереализационных доходов и расходов | -6618 |
| 6. Итого прибыль за отчетный период | 20441 |
| 7. Налоги из прибыли и иные обязательные платежи | 7483 |
| 8. Чистая прибыль | 12958 |

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ОАО «Світанак» г. Жодино на 01.01.2011 года (млн руб)

| АКТИВЫ | | |
|---|---|---|
| 1. | Внеоборотные активы, всего | 81863 |
| | в том числе: | |
| | 1. Основные средства | 80123 |
| | 2. Нематериальные активы | 555 |
| | 3. Вложения во внеоборотные активы | 1185 |
| 2. | Оборотные активы, всего | 57098 |
| | в том числе: | |
| | 1. Запасы и затраты | 57098 |
| | 2. Налоги по приобретенным ценностям | 4042 |
| | 3. Дебиторская задолженность | 2822 |
| | 4. Финансовые вложения | 115 |
| | 5. Денежные средства | 1526 |
| | Итого активы | 147466 |
| ПАССИВЫ | | |
| 3. | Капитал и резервы | 116230 |
| | в том числе: | |
| | 1. Уставный фонд | 80634 |
| | 2. Резервный фонд | 831 |
| | 3. Добавочный фонд | 12098 |
| | 4. Нераспределенная прибыль | 22667 |
| 4. | Обязательства: | 31236 |
| | в том числе: | |
| | Кредиты банков | 15743 |
| | Кредиторская задолженность | 15136 |
| | Итого пассивы | 147466 |

### ИНФОРМАЦИЯ о дивидендах и акциях, количестве акционеров, задолженности по ОАО «Світанак» г. Жодино за 2010 год

| Показатель | Ед. изм. | За 2010 год | За 2009 год |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 9835 | 9839 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 6 | 6 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 9829 | 9833 |
| начислено на выплату дивидендов | млн руб. | 675 | 587 |
| Дивиденды приходящиеся на 1 акцию (включая налоги) | руб. | 853,86 | 742,54 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тыс. руб. | 143,94 | 115,77 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 913 | 1512 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | 143 | 50 |
| Среднесписочная численность работающих | чел. | 2742 | 2774 |

УНН 600038919


З людзьмі і сам-насам

# НОВЫЯ ЛІСТЫ ПРА ГАЛОЎНАЕ

**...Добра кухару: нечага нагатаваў, папрацаваў і адразу ж, лічы, бачыць вынік: што з'елася, што не з'елася, за што падзякавалі...**
**Нашаму брату, журналісту, у гэтым сэнсе складаней, бо напісаць напісаў, а што там далей...**
**Зрэшты, выключэнні бываюць. «Ніколі не думала, што на прыкладзе асобнай сям'і можна гаварыць пра такія складаныя рэчы, як нацыя ды дзяржава («Звязда» 21 лютага. — Аўт.)»; «У чалавека, якія прапануе ўсім беларусам перайсці на рускую мову, хачу спытаць, а чаму менавіта на рускую? Давайце адразу, каб час не марнаваць, на болей распаўсюджаную англійскую, альбо на кітайскую (вунь кітайцаў ужо 2 мільярды)...»; «Ёсць манкурты — людзі, што забыліся на сваё мінулае, выракліся ўсяго свайго, ёсць «інтэлігенты», якія грэбуюць роднай мовай, і я не ведаю, ад каторых болей шкоды для нашай Бацькаўшчыны»...**
**Гэта — як вы разумееце, *радкі* з лістоў. А ёсць, з дазволу, Лісты.**




«Пра пакутніцу, нашу мову, напісана шмат. У мяне ж найперш пытанне, — піша **Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў,** — ці чытае «Звязду» чынавенства, кіраўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў, ці хвалюе іх стан роднай мовы? Бо пішуць (тыя ж «Лісты пра галоўнае»), як я разумею, людзі сталага ўзросту, якіх і на жаль, цяпер мала слухаюць. Вось і ствараецца ўражанне, што пагаворым мы, пашумім ды на тым самым месцы і сядзем.

А жыццё мяняецца, з'яўляецца многа новага, з ім прыходзяць новыя словы — найчасцей замежныя. Таму кнігі, напісаныя 200—300 гадоў таму, нават Скарынінская «Біблія» ўсім зразумелая, а вось асобныя артыкулы з газет чытаць цяжкавата — хоць ты слоўнік бяры...

Бачыцца мне і такая бяда, — працягвае спадарыня Валянціна, — як навала англамоўных слоў, пашана замежнай мове: усюды стракацяць лацінскія літары, у садках наша малеча вывучае англійскую. Мы быццам жывём і збіраемся жыць у краіне замежнікаў. А што ж свая — краіна, мова. Яны нічога не вартыя?»

І далей: «У дыскусіі на старонках «Звязды» выказваюцца розныя меркаванні — наконт мовы, наконт слоў. Не без таго — зазіраю і я ў розныя слоўнікі, думаю, успамінаю. Проста, як быццам — лаўка — крама — магазін. Бабуля казала: «Іду ў лаўку», «Купіла ў лаўцы». У вёсцы была невялікая крамка, таму і лаўка. А вось вялікі магазін, універсам ці правільна называць крамай? Прыцягнулі ўвагу словы *работа і праца.* Чамусьці першае — у тым ліку на старонках газеты — ужываецца ўсё менш і менш. А чаму, хто б прасвятліў — напісаў для шырокага кола чытачоў, дзе якое слова ўжываць? Прычым правільна, бо ў слоўніках значэнняў шмат...

Далей. З'явілася слова *гулец*. Няхай. А як тады быць са словамі *выйграць, прайграць, ігрышча?* Ці вось слова ходнікі. У вёсках так называюць саматканыя палавічкі, а пра тратуар так казаць неяк нязвычна. Ці возьмем слова *мінак*. Чалавек, трэба разумець, ужо не ўглядаецца ў навакольнае жыццё, мала на што звяртае ўвагу, ён абыякавы. У дачыненні да яго, вось такога, слова мінак трапнае, а як да іншых?

Альбо вось яшчэ адно назіранне. У беларускай мове і чырвоныя, і белыя, і чорныя — усё *парэчкі*. У рускай — усё *смородина*. А на маю думку, гэта розныя расліны, хоць і вельмі падобныя. Смурода (як звалі чорныя ягады нашы старыя) мае свой асаблівы пах. Таму ў нас на базары і цяпер пытаюць асобна парэчку, асобна *смуроду, смародзіну.* Дык мо час яе «ўзаконіць», уключыць у нашы беларускія слоўнікі?»

Каб сказаць, наколькі гэта важна — пісаць і гаварыць правільна — спадарыня Валянціна ўзгадвае сваё студэнцтва, піша: «Сучасную рускую мову» ў нас выкладаў дацэнт Мікалай Аляксандравіч Маслюкоў. У яго быў нетрадыцыйны падыход да мовы. Яго лекцыі не прапускаў ніхто, але... Ну вось да прыкладу. Аднойчы дзяўчаты заспалі (руская мова была першай

ДУМКА З КАНВЕРТА

Нікога, як падаецца, не бянтэжыць выкарыстанне запазычаных слоў *менеджар, кворум, кансенсус...* Нешта ў нашай мове няма адпаведнікаў? А вось наконт адсоткаў ды *зніжак* трэба гвалт усчаць... Мне асабіста яны падаюцца і адметнымі, і вартымі ўжывання, бо яны — на беларускі манер.

Да таго ж ва ўсіх дзяржавах галоўныя дзяржаўныя газеты выдаюцца на мове карэннага насельніцтва. А што ж у нас?

Вось пра што трэба гаварыць.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*В. Лучын, Рагачоўскі раён.*

парай) — спазніліся на лекцыю. А гэта ж непазбежна — выкладчык спытае, чаму? Дамовіліся, што будуць гаварыць праўду. То зайшла ў аўдыторыю першая, чуе строгае:

— Почему вы опоздали?

— Проспáла.

— Закройте дверь с той стороны, — загадвае выкладчык.

Заходзіць другая.

— Вы почему опоздали?

— Проспáла.

Выгнаў і тую. Апошняй зайшла Люда Кузьменка.

— А вы почему опоздали?

— Проспалá.

— Проходите, садитесь.

«Вось так нас вучылі мове, — піша спадарыня Гудачкова. — Часу прайшло шмат, многае змянілася, забылася. Але ж адчуваецца, што няма цяпер былой павагі да слова. Я паважаю яго ўсё жыццё — раблю памылкі, выпраўляю, зноў памыляюся. Ведаю: трэба больш чытаць, больш пісаць, гартаць падручнікі і слоўнікі, патрэбна моўная практыка, але... У руках часцей не кніжка, а рыдлёўка ды сякера»...

«Зрэшты, што з мяне ўзяць, — сама ў сябе пытае спадарыня Валянціна і сама ж адказвае, — я, на жаль, надвор'я не зраблю. А вось газеты, тэлебачанне... Ну вельмі ж «свабодна» яны абыходзяцца цяпер са словам, вельмі шмат дапускаюць памылак. Правільнай прыгожай мовы — як беларускай, так і рускай, лічы, не чуваць».

Грэх з гэтым не згадзіцца! Грэх не прыслухацца, грэх не зрабіць пэўных захадаў (але аб іх крыху пазней). Пакуль — яшчэ адзін ліст.

ДУМКА З КАНВЕРТА

«Вось «Звязда» паведамляе прызнанне віцэ-прэм'ера А. Тозіка аб тым, што «ў апараце Савета Міністраў працуюць 322 супрацоўнікі і ніводны з іх не валодае свабодна замежнымі мовамі. І гэта ў краіне, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы...».

Абуральна? Так, але ж мне больш цікава, ці валодаюць яны мовай тытульнай нацыі? На якой мове праходзяць пасяджэнні і нарады? Вельмі сумняваюся, што на роднай. Закон аб мовах абавязвае кіраўнікоў усіх рангаў валодаць дзвюма дзяржаўнымі, але ж у нас няма механізма яго практычнага дзеяння. Пры падборы і прызначэнні кіруючых асоб гэта патрабаванне пакуль не ўлічваецца.

**М.П. ДУБОВІК,**
*вёска Арэшкавічы Бярэзінскага раёна.*

«Звязду» выпісваю вельмі даўно, — піша **Юлія Рыгораўна Міхута з в. Нова-Баршчоўка, Лоеўскага раёна.** — Выбар абумоўлены менавіта мовай газеты, яе беларускасцю і беларускамоўнасцю. У нашай мясцовасці людзі размаўляюць на так званай трасянцы, але ж гэта не перашкаджае ім любіць сваю. Помню, з якім замілаваннем слухала яе, дастаткова чыстую, літаратурную, ды «жыўцом», на Гродзеншчыне, на Міншчыне. Але ж ніколі, здаецца, — ад нашых кіраўнікоў. Карыстацца ёю яны лічаць за абразу, ці што?

Таму ў справе адраджэння мовы на іх, мусіць, не варта ўскладаць вялікіх надзей, хоць, безумоўна ж, працэс распаўсюджвання зверху ўніз быў бы больш эфектыўным. А вось на дзеячаў культуры, на сродкі масавай інфармацыі (асабліва тэлебачанне) спадзявацца хацелася б, бо яны могуць многае, калі, зразумела, ёсць там хоць жменька патрыётаў. Пакуль жа з экранаў гучыць толькі другая дзяржаўная. Адзін, лічы, прыкметны голас — у Міхася Равуцкага. Няўжо ж болей ніхто не ведае беларускай? Ці проста каманды не было перайсці на яе? Упэўнена: першы **нацыянальны** канал павінен вяшчаць па-беларуску. Гэта — без варыянтаў.

А вось радыё мяне цешыць. Там працуюць сапраўдныя патрыёты! Таму я зусім мала гляджу тэлевізар, болей слухаю іх».

Што называецца — досвед варты пераймання (тым больш, што тэлевізар глядзець не модна)!..

Але ж гэта не ўсё: ёсць у Юліі Рыгораўны і сваё меркаванне наконт старых, забытых слоў: «Не патрэбна іх выцягваць немаведама адкуль, — лічыць чытачка. — Ну і што, што яны некалі былі, але ж не прыжыліся, забыліся».

Да гэтай тэмы газета звярталася і не раз, але ж...

У апошні.

Многія лічылі (і лічаць!), што «не прыжыліся» (і нават не прыжывуцца) у нас слова *спадар, спадарыня, спадарства.* Мне асабіста гэта нагадвае даўні сатырычны малюнак. На ім (бачу як зараз) было вясельнае, упрыгожанае аўто, наперадзе ў якога бегла жанчына (трэба разумець маці жаніха ці нявесты) з «транспарантам: «А я ўсё роўна супраць!».

Вось і мы некага (нечага) не прымаем, упарцімся, губляем час, а потым не разумеем, чаму гэта іншыя... бабулі ўжо цешацца ўнукамі, чакаюць праўнукаў, а мы ўсё выбіраем, шукаем (ці чакаем?) таго найлепшага жаніха, тую найлепшую нявесту. Замест таго, каб проста прыняць тых, каго, магчыма, сам Бог нам даваў... І паспрыяць — маладой сям'і. Альбо слову. Гэта складана? Ды калі б... А то замяніце заўтра «Паважаныя пасажыры, сябры, гледачы, слухачы, спажыўцы, карыстальнікі...» на «Шаноўнае спадарства» ў гарадскім транспарце, сродках масавай інфармацыі, у навучальных установах, працоўных калектывах, «пракруціце» некалькі рэкламных ролікаў па тэлебачанні і праз тыдзень (!) справа зроблена: з'явіўся свой зварот, з'явілася пачуццё нацыянальнай прыналежнасці і годнасці.

Можна, ну вядома ж, гэтага не рабіць, — чакаць далей, заставацца «мужчынамі» і «жэншчынамі», можна ўзняць чарговую дыскусію на тэму, у каго лепш пазычыць зварот — у палякаў ці ўсё ж расіян? Бо свой жа горшы...

Пісала «Звязда» і пра слова *супруги*, якое ў перакладзе на беларускую «дзеліцца» на два — асобна муж, асобна жонка. А навошта асобна, калі было ў нашай мове слова сужэнцы?..

Як быў і застаецца бясконцы россып іншых прыгажэнных слоў: *безмеж* (бязмежны прастор), *неруш* (нешта некранутае...), *парукацца* (павітацца за руку), *паняверка* (страта веры), *пачужэць* (стаць некаму чужым), *прадажнік* ( чалавек, які за нешта прадаўся), *сухмарак* (белая бездажджавая хмарка), *тараноўка* (вялікая цёплая хустка), *фундуш* (шчодрая ахвяра на патрэбы царквы), *фатэль* (мяккае крэла), бо ёсць яшчэ не мяккае, якое, нават тыя, хто ведае беларускую часта называюць стулам, хоць стул па-беларуску — гэта (прабачце за фізіялогію) толькі дзеянне кішэчніка.

Большасць з прыведзеных (і не прыведзеных!) рэдка ўжывальных слоў у тлумачальных слоўніках

ДУМКА З КАНВЕРТА

Наша мова на міжнародным узроўні аднесена да ліку знікаючых. У гэта верыш, калі цягам дня, пераключы каналы тэлебачання, не зловіш ніводнага беларускага слова. А чаму? Няўжо дзяржава, дзе 84 адсоткі насельніцтва, паводле апошняга перапісу, лічаць сябе беларусамі, не можа стварыць хоць бы адзін беларускамоўны канал?!»

**Алена МАРОЗАВА,** *г. Мінск.*

пазначана кароткім «абл.» Гэта значыць, што яны, гэтыя моўныя скарбы, характэрны для пэўных мясцін: ужываюцца, напрыклад, на той самай Гродзеншчыне альбо... Гомельшчыне, дзе жыве шаноўная чытачка з прыгожым прозвішчам Міхута, дзе, цалкам магчыма, жылі,

ДУМКА З КАНВЕРТА

«Колькі дзён таму па радыё чуў (першы раз за жыццё) выступленне нашага раённага чыноўніка ( і з досыць высокай пасадай!)... Ён гаварыў па-беларуску. Вушам не паверыў! Дык мо і сапраўды не ўсё так дрэнна?

**Міхаіл СПІРЫДОВІЧ,** *г.п. Івянец*

ужываючы гэтыя словы, яе бацькі, яе дзяды і прадзеды...

Не веру, што ёй, наступніцы, любячы беларускую, не хочацца чуць, не хочацца бачыць на старонках газеты словы сваіх прашчураў ( альбо і свае). Іншая справа — чужыя. Рэжуць, магчыма, вуха, раздражняюць вока. Бо не заўжды разумееш сэнс.

Значыць, у гэтым і наша віна, — паспрабуем тлумачыць: у бліжэйшы час у газеце, дасць Бог, з'явіцца адпаведная рубрыка.

Але ж ёсць, на жаль, рэчы, якія тлумачыць цяжка. У чарговым канверце — ліст з фатаграфіяй. «Людзі абураюцца — і справядліва — калі чуюць слова *дзярэўня*, піша **спадар Лукша з Пастаўшчыны.** — У нас жа яго не проста гавораць, а, як бачыце, пішуць. З'явіўся гэты паказальнік на месцы ранейшага «Старая вёска» не так даўно, пасля капітальнага рамонту дарогі Камарова (Мядзельскі раён) — Лынтупы (Пастаўскі) і, безумоўна ж, стаў рэзаць вочы. Але ж я, напэўна, змаўчаў бы, калі б не публікацыі ў «Звяздзе». Пасля іх — не хачу, бо дарога гэта вядзе да заказніка «Блакітныя азёры», летам туды цугам ідзе і едзе народ. Чым для яго стане гэта *дзярэўня*? Ну, безумоўна ж, аб'ектам насмешак і лыжкай дзёгцю, здольнай сапсаваць усе ўражанні».

Не думаю, што з'явілася яна, гэтая лыжка, ад непісьменнасці. Вёску, мо, і насамрэч звалі вось так — Старой Дзярэўняй. Ну былі ж на карце Хрэнава, Ліхадзеі, Плевакі... А колькі засталося — Пабядзіцеляў, Акцяброў, Ленінаў, Лучоў, Дзвігацеляў, Залогаў Пяцілеткі... Ёсць нават Сярэнеўка, з якой, па чутках, дзяўчатак замуж не бяруць... З гэтым рабіць нешта трэба, а вось са Старою Вёскай?..

Колькі галоў, — столькі меркаванняў.

Але ж з таго ліста, з Пастаўшчыны, ад спадара Лукшы варты цытавання і наступныя радкі. «Хочацца добрым словам узгадаць дырэктара нашага прадпрыемства (Лынтупскі спіртзавод) Алега Мікалаевіча Анціфорава. Ён на гэтай пасадзе яшчэ толькі год, але з яго прыходам многае змянілася. У тым ліку з мовай: беларуская стала гучаць на нашых сходах, па-беларуску напісаны шыльды на дзвярах. Ведаю, што многім гэта вельмі падабаецца, многім — не. І апошніх, напэўна, больш. Але я лічу, што на гэта зважаць не варта, і чакаць пакуль па-беларуску загаворыць начальства — таксама. Трэба пачынаць з сябе: замест «Здрасьце» сказаць «Добры дзень», «Добрай раніцы», узяць у рукі беларускую кніжку, газету і справа зрушыцца — у адной, асобна ўзятай галаве, потым у адной-другой асобна ўзятай сям'і. А далей болей».

Хто «за»? Хто «супраць»? Пішыце.

**Валянціна ДОЎНАР.**

*(Працяг будзе.)*

